Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 КРАСАВІКА 2017 г. СУБОТА № 62 (28426)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## СІМВАЛ ВЯЛІКАЙ КАШТОЎНАСЦІ

**Дарагія беларусы і расіяне!**

Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі — не проста знамянальная дата ў новай гісторыі нашых краін, гэта пацвярджэнне духоўнай і культурнай блізкасці двух брацкіх народаў, цеснага палітычнага і эканамічнага партнёрства.

Гэты год адметны ўдвая — пачаткам трэцяга дзесяцігоддзя саюзнага будаўніцтва і 25-годдзем устанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі.

Перавагі саюзнай інтэграцыі бясспрэчныя. Мы разам уносім вялікі ўклад у забеспячэнне сацыяльных гарантый і роўнасці правоў беларусаў і расіян, а таксама паглыбленне двухбаковых гуманітарных сувязяў.

Высокі ўзровень даверу дазваляе нам цесна ўзаемадзейнічаць у сферы знешняй палітыкі і бяспекі.

За параўнальна кароткі адрэзак часу саюзны праект раскрыў вялікі стваральны патэнцыял для далейшага развіцця эканомік Беларусі і Расіі. Згуртаваныя цеснымі кааперацыйнымі сувязямі, узаемадапаўняльнасцю нашых прамысловых і аграрных комплексаў, трывалымі кантактамі на ўзроўні рэгіёнаў, мы павінны яшчэ больш настойліва і паслядоўна дабівацца стварэння паўнавартаснай адзінай эканамічнай прасторы, ліквідацыі ўсіх бар'ераў, якія перашкаджаюць развіццю нашай інтэграцыі. Пры гэтым у адпаведнасці з патрабаваннямі часу нам неабходна арыентавацца на навукаёмістыя і высокія тэхналогіі, здольныя надаць імпульс двухбаковаму эканамічнаму развіццю.

Прызнанне відавочных поспехаў саюзнага будаўніцтва, шэраг яго інавацыйных напрацовак уносяць важкі ўклад у фарміраванне жыццядзольнай архітэктуры еўразійскай інтэграцыі.

Аднак маштаб дасягненняў не павінен успрымацца як дадзенасць. Рознага роду выпрабаванні на трываласць выяўляюць іх кволасць. Таму сумеснымі намаганнямі мы зможам эфектыўна пераадолець цяжкасці, якія дыктуе нам сусветны парадак дня, адкрыць новыя магчымасці для ўздыму нацыянальных эканомік, павышэння дабрабыту нашых народаў і дзяржаў.

Дзень яднання — сімвал вялікай каштоўнасці беларуска-расійскай дружбы. Гістарычная памяць і ўзаемная падтрымка заўсёды былі для нас вышэй за любыя меркантыльныя або тактычныя меркаванні, і наш агульны абавязак — захоўваць вернасць гэтаму лёсаванзначальнаму выбару, які адпавядае чаканням і памкненням народаў Беларусі і Расіі.

Перакананы, што імкненне людзей да сумеснага тварэння, якое ідзе ад жыцця, будзе паспяхова рэалізоўвацца.

Хай нашы адносіны мацнеюць дзень ад дня, прыносячы ўпэўненасць у будучыні, мір і згоду!

Ад усёй душы віншую вас з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі!

Здароўя і дабрабыту вам, вашым родным і блізкім!

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА,**
**Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы,**
**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.**

# ЗДАБЫТАЯ СОЛЬ ЗЯМЛІ

## «ДЛЯ БЕЛАРУСІ БЫЛО СПРАВАЙ ГОНАРУ, КАБ ДРУЖАЛЮБНЫ ТУРКМЕНІСТАН АТРЫМАЎ ПЕРАДАВОЕ ПРАДПРЫЕМСТВА», — СКАЗАЎ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НА АДКРЫЦЦІ ГАРЛЫКСКАГА ГОРНА-АБАГАЧАЛЬНАГА КАМБІНАТА



Фота БЕЛТА.

Афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Туркменістан быў прымеркаваны да надзвычай важнай падзеі ў жыцці гэтай сярэднеазіяцкай краіны — афіцыйнага пуску Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната. І гэта не выпадкова: стратэгічны прамысловы аб'ект узводзіўся пры актыўным удзеле Беларусі.

Гарлыкскае радовішча калійных соляў на паўночным усходзе Туркменістана было разведана яшчэ ў 1964—1966 гадах. Аднак тады Савецкі Саюз не валодаў неабходнымі тэхналогіямі для будаўніцтва маштабнай вытворчасці.

Гэта стала магчыма ў 2010 годзе, калі беларускі генпадрадчык ААТ «Белгархімпрам» падпісаў з дзяржаўным канцэрнам «Туркменхімія», які выступіў у якасці заказчыка, контракт на будаўніцтва пад ключ Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната. Кошт праекта ацанілі ў $1 млрд. Будаўніцтва вялося сіламі 14 беларускіх і 22 туркменскіх падрадных арганізацый. Агульная колькасць працуючых на пляцоўцы перасягнула 2,3 тысячы чалавек, практычна палавіну з іх склалі грамадзяне Беларусі.

СТАР. 2

# Навіны пад рукой



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8721 | ▲ |
| Еўра | 2,0002 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0334 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0692 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

■ Навука — медыцыне

# КАБ ПАЧУЦЬ СЛОВА «МАМА»

## Як генетыкі дапамагаюць жанчынам ажыццявіць сваю мару

**Па звестках Міністэрства аховы здароўя нашай краіны, кожная пятая чаканая цяжарнасць завяршаецца ў жанчын спантанным абортам. Прычыны невыношвання цяжарнасці могуць быць самыя розныя. Але даволі часта здараецца, што ўрачы не могуць вызначыць, чаму жанчына штораз губляе яшчэ ненароджанае дзіця. І вось тут у справу ўступаюць генетыкі.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### Фатальныя гены

— Паводле апошніх даследаванняў, адной з галоўных прычын страты цяжарнасці з'яўляецца спадчынная трамбафілія, — тлумачыць **кіраўнік лабараторыі генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук, доктар біялагічных навук, прафесар Ірма МАССЭ**. — Справа ў тым, што генетычная схільнасць да спадчыннай трамбафіліі ніяк не праяўляецца да таго моманту, пакуль жанчына не зацяжарыць. Менавіта цяжарнасць становіцца правакуючым фактарам. Таму нават пры планаванні мацярынства жанчына, якая праходзіць папярэднюю дыягностыку, чуе ад урача: «Усе паказчыкі ў вас у норме, можаце цяжарыць...» Аднак першая, другая і кожная чарговая спроба нарадзіць дзіця завяршаецца выкідышам або цяжарнасць замірае.

СТАР. 7

# ЗДАБЫТАЯ СОЛЬ ЗЯМЛІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Учора кіраўнікі дзвюх дзяржаў ва ўрачыстай абстаноўцы перарэзалі стужку і націснулі сімвалічную кнопку запуску работ, азнаёміліся з прадпрыемствам і яго вытворчымі магчымасцямі.

Выступаючы на цырымоніі адкрыцця вытворчасці, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што будаўніцтва Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната задало новы скорасны рэжым у рэалізацыі такіх праектаў на постсавецкай прасторы. Фактычна за пяць гадоў быў пройдзены шлях ад геалагічных пошукаў да выпуску першай партыі ўгнаенняў. «Удалося захаваць аптымальны кошт будаўніцтва, беспрэцэдэнтны для такіх аб'ектаў, і не страціць як у якасці, так і ў тэмпе», — звярнуў увагу Прэзідэнт, выказаўшы ўпэўненасць, што адкрыццё камбіната акажа вялікі ўплыў на эканоміку Туркменістана.

З цягам часу тут з'явяцца 2 тысячы высокапрадукцыйных рабочых месцаў на самім камбінаце, а затым спатрэбяцца працоўныя рэсурсы і ў сумежных сферах — забеспячэнні, лагістыцы, збыце. Істотны імпульс да развіцця атрымае аграрны комплекс краіны. Маючы доступ да ўласных калійных угнаенняў, сельскагаспадарчая галіна зможа павысіць канкурэнтаздольнасць прадукцыі на знешніх рынках, павялічыць даходы ад экспарту.

«Прынцыпова важна, што ў беларуска-туркменскіх адносінах з'яўляецца напрамак, дзе нашы краіны змогуць і далей супрацоўнічаць, узаемна абагачаючы адна адну», — канстатаваў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Калі пачыналі будаўніцтва, было вельмі шмат праблем. Мы іх пераадолелі. Для Беларусі было справай гонару, каб дружалюбны Туркменістан атрымаў передавое прадпрыемства. Выкананне гэтай задачы стала як сур'ёзным экзаменам для нас і Туркменістана, так і вялікім вопытам, які спатрэбіцца тут», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў адзначыў важнасць такой вытворчасці для краіны. Паколькі з уводам у строй камбіната ў краіне фактычна запушчана новая і перспектыўная галіна горна-хімічнай прамысловасці. Паводле яго слоў, прадукцыя камбіната закрые ўнутраныя патрэбнасці Туркменістана і будзе экспартавацца.

Учора афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Туркменістан завяршыўся. Аляксандра Лукашэнку ў аэрапорце праводзіў асабіста Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў. Кіраўнікі дзвюх дзяржаў паспелі правесці кароткую гутарку і цёпла развіталіся.

**Паводле БЕЛТА.**

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

3 красавіка 2017 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца адкрыццё другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

■ Блізкая ўлада

# РАБОТА З ЛЮДЗЬМІ — ГАЛОЎНЫ ПРЫЯРЫТЭТ ПАРЛАМЕНТАРЫЯЎ



**Падчас нарады ў кіраўніка дзяржавы, прысвечанай актуальным пытанням развіцця краіны, Прэзідэнт падзякаваў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў за тое, што яны літаральна адзіныя ўніклі ў сутнасць дэкрэта №3 і правільна яго зразумелі. Відаць, гэта яшчэ адзін доказ таго, што парламентарыі рэальна выконваюць адну са сваіх найважнейшых функцый — сувязнога звяна паміж выбаршчыкамі і ўладай. Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА расказаў «Звяздзе», як дэпутаты Палаты прадстаўнікоў выбудоўваюць адносіны з выбаршчыкамі.**

***Дзякуючы рабоце парламентарыяў у акругах, пастаянцам кантакту з выбаршчыкамі дэпутаты паднялі пытанне аб недасканаласці некаторых пунктаў дэкрэта...***

— Так. Дэпутаты не па чутках ведаюць праблемы, з якімі звяртаюцца грамадзяне. Непасрэдная работа з людзьмі заўсёды была і застаецца галоўным прыярытэтам парламентарыяў. Асаблівая ўвага пры гэтым удзяляецца тым, хто больш за ўсё мае патрэбу ў падтрымцы, — шматдзетным сем'ям, старым, сіротам, інвалідам. І, вядома, вопыт вырашэння такіх праблем улічваецца ў нашай заканадаўчай дзейнасці. Дарэчы, яшчэ дэпутаты пятага склікання, каб прадухіліць мноства магчымых няпростых момантаў у жыцці людзей, прапанавалі даць мясцовым Саветам дэпутатаў права вызваляць грамадзян, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, ад выплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў. Сёння гэта палажэнне замацавана ў дэкрэце №3.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў шостага склікання з улікам вопыту сваіх папярэднікаў прапанавалі значна пашырыць пералік грамадзян, якія могуць быць вызвалены ад выплаты гэтага збору. Прапанавана таксама ўвядзенне механізму адтэрміноўкі ці растэрміноўкі выплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў па аб'ектыўных прычынах. У цяперашні час дэпутаты актыўна дапамагаюць мясцовым уладам удакладняць спісы такіх людзей, весці растлумачальную работу па дэкрэце №3. Як вынік, колькасць грамадзян, якія прыходзяць на прыём з падобнымі пытаннямі, пастаянна зніжаецца. Трэба сказаць, што велізарную работу ў гэтым напрамку праводзіць Пастаянная камісія па працы і сацыяльных пытаннях і непасрэдна яе старшыня Тамара Красоўская. Менавіта ў гэтай камісіі акумулюецца ўся інфармацыя аб праваприямяненні дэкрэта.

***— Дапамога людзям у пошуках працы — адна з галоўных задач, якую Прэзідэнт паставіў перад мясцовымі ўладамі. Да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў таксама нярэдка звяртаюцца з адпаведнай просьбай. Ці атрымліваецца дапамагчы?***

— Кожны канкрэтны выпадак патрабуе асаблівага разгляду. І дэпутаты, дзейнічаючы ў прававым полі, робяць усё, каб дапамагчы людзям. Але рашэнне гэтай праблемы ў цэлым патрабуе комплекснага падыходу. Гэта разнявоненне дзелавой ініцыятывы, мадэрнізацыя вытворчасці, стварэнне новых працоўных месцаў, арганізацыя перападрыхтоўкі кадраў. Нарэшце, вялікае значэнне мае і зацікаўленасць саміх людзей у працаўладкаванні. У адзіночку ўсе гэтыя пытанні не вырашыць. Таму дэпутаты працуюць у цесным кантакце з мясцовымі органамі ўлады, кіраўнікамі прадпрыемстваў, структурамі грамадзянскай супольнасці, шукаюць новыя формы работы.

Возьмем хоць бы апошні прыклад. Па ініцыятыве дэпутата Максіма Місько мінскія парламентарыі сабраліся са сваімі калегамі гарадскога і раённага ўзроўняў, запрасілі на гэтую сустрэчу кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна сталіцы, работнікаў службы занятасці і кіраўнікоў працоўных калектываў. У ходзе сустрэчы было ўдакладнена, колькі жыхароў раёна маюць патрэбу ў працаўладкаванні і якія месцы ім могуць прапанаваць прадпрыемствы. Пасля гэтага ў раёне правялі кірмаш вакансій, дзе было прапанавана больш за 870 працоўных месцаў у самых розных сферах. Прычым разам са спецыяльнасцямі накшталт дворніка ці грузчыка былі прапановы, якія патрабуюць ад саіскальнікаў досыць высокай кваліфікацыі, напрыклад інжынер-электрык, галоўны бухгалтар, галоўны эканаміст. Толькі на працягу гадзіны пасля адкрыцця на кірмаш прыйшло больш за дзве сотні чалавек. Важна, што ўсе людзі маглі непасрэдна пагаварыць з работадаўцамі, распытаць пра ўмовы, аплату працы. Зразумела, што прапанаваныя вакансіі прыйшліся даспадобы не ўсім, і ўсё ж дзясяткі людзей змаглі ў гэты дзень вырашыць свае праблемы з працаўладкаваннем. Ацаніўшы эфект мерапрыемства, адміністрацыя раёна вырашыла праводзіць падобныя кірмашы кожны тыдзень.

Такая работа ў той ці іншай форме актыўна праводзіцца сёння ва ўсіх рэгіёнах. Важна, што дэпутаты не сядзяць у кабінетах, а ідуць да людзей і высвятляюць, што іх турбуе.

Зразумела, сярод беспрацоўных ёсць людзі, якіх можна аднесці, скажам так, да групы рызыкі. Гэта, напрыклад, тыя, хто вярнуўся з месцаў пазбаўлення волі. Усе ведаюць, што ім цяжэй за ўсё працаўладкавацца. З іншага боку, ёсць і тыя, хто працаваць не прывык і не жадае. Але ўсё ж гэта нашы грамадзяне, і ім трэба прынамсі прапанаваць працоўныя месцы, хай нават не самыя прэстыжныя, але якія даюць сталы прыбытак. Можа быць, гэта дапаможа камусьці змяніць сваё жыццё да лепшага. І дэпутаты ва ўзаемадзеянні з праваахоўнымі органамі таксама займаюцца такімі праблемамі. Гэта ўсяго толькі некалькі прыкладаў, але яны тыповыя і даюць магчымасць уявіць сабе агульную карціну той работы, якую сёння дэпутаты Палаты прадстаўнікоў праводзяць у сваіх выбарчых акругах.

***— Як было адзначана на нарадзе, кіраўнікам трэба шчыра гаварыць з людзьмі, унікаць у іх праблемы. Наколькі даверным атрымліваецца дыялог з людзьмі ў дэпутатаў?***

— Такі дыялог ідзе пастаянна: у рамках асабістых прыёмаў, у ходзе сустрэч з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, падчас правядзення прамых тэлефонных ліній і, нарэшце, у медыясферы. Дэпутаты актыўна ўключаюцца ў дыскусіі па самых розных пытаннях, інфармуюць насельніцтва аб рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, тлумачаць заканадаўства, прыцягваюць грамадзян да абмеркавання законапраектаў. Тыя ж сталічныя дэпутаты сфарміравалі дэпутацкі клуб. Яны сустракаюцца на пляцоўцы інфармацыйнага агенцтва «Мінск-Навіны», дзе з удзелам журналістаў і экспертаў абмяркоўваюць самыя гарачыя тэмы, якія хвалююць не толькі мінчан, але і ўсіх жыхароў Беларусі. Гэта і развіццё эканомікі, і падатак на дармаедства, і фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, і іншыя не менш важныя пытанні. Важна, што дзякуючы журналістам меркаванні дэпутатаў адразу ж становяцца здабыткам грамадскасці.

Не сакрэт, што незадаволенасць дэкрэтам №3 была выклікана перш за ўсё недасканалай пастановкай растлумачальнай работы. Гэтым і скарысталіся некаторыя апаненты ўлады, якія імкнуцца любымі сродкамі зарабіць сабе палітычны капітал. Пры гэтым ніякай пазітыўнай праграмы ў іх, зразумела, не было і няма. Іх галоўная мэта — пасеяць недавер да ўлады і расхістаць сацыяльна-палітычную абстаноўку ў краіне. У адрозненне ад гэтых палітыкаў парламентарыі, такія, напрыклад, як Ігар Марзалюк, выходзілі да пратэстоўцаў не з пустымі лозунгамі, а каб пачуць грамадскую думку і прапанаваць канкрэтныя шляхі вырашэння існуючых праблем.

І ўсё ж людзей, якія незадаволены жыццём, але нічога не робяць, каб яго змяніць, у нас меншасць. Значна больш грамадзян, якія неабыякава ставяцца да свайго лёсу, лёсу сваёй краіны. Яскравым доказам гэтага стала акцыя «Наш дом», арганізаваная ў Магілёве дэпутатам Вольгай Петрашовай. Жыхары мікрараёнаў, моладзь, пенсіянеры, грамадскія актывісты з задавальненнем адгукнуліся на заклік дэпутата зрабіць свой горад больш утульным, прыгожым і ўласным прыкладам паказалі, як можна спакойна і выніковa вырашаць надзённыя праблемы, не чакаючы, пакуль нехта зробіць гэта за іх.

А ў цэлым, вядома, дыялог з грамадствам — гэта не разавая акцыя, а штодзённая карпатлівая праца, ад якой шмат у чым залежыць прававая і палітычная культура грамадства, кансалідацыя народа і яго здольнасць супрацьстаяць самым няпростым выпрабаванням у жыцці краіны. І дэпутаты да такой працы гатовы.

**Пытанні задавала**
**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Былога прэзідэнта Паўднёвай Карэі арыштавалі па справе карупцыі



Улады Паўднёвай Карэі арыштавалі былога прэзідэнта краіны Пак Кын Хэ па справе карупцыі, паведамляе агенцтва «Ёнхап». Суд Сеула пастанавіў заключыць яе пад варту па абвінавачванні ў хабарніцтве, злоўжыванні ўладай, а таксама выдаванні дзяржаўнай таямніцы.

Пак Кын Хэ была адхілена ад улады 10 сакавіка. Прычынай скандалу стала варажбітка і блізкая сяброўка прэзідэнта Чхве Сун Сіль. Яе абвінавачваюць у ціску на дзясяткі найбуйнейшых фірмаў з мэтай пералічэння імі грошай у два некамерцыйныя фонды. У справе фігуруе сума ў 77,4 мільярда вон (65,6 мільёна долараў).

Пак Кын Хэ стала трэцім былым прэзідэнтам краіны, які былі арыштаваны па крымінальных абвінавачаннях, — пасля Ро Дэ У і Чон Ду Хвана.

## ЗША больш не хочуць зрынаць Башара Асада

Адхіленне Башара Асада з пасады прэзідэнта Сірыі больш не з'яўляецца галоўнай мэтай амерыканскай палітыкі ў гэтай краіне, заявіла прадстаўнік ЗША ў ААН.

Нікей Хэйлі сказала, што галоўным прыярытэтам для Амерыкі стане пошук магчымасцяў змены жыцця сірыйцаў да лепшага.

Паводле яе слоў, менавіта такая палітыка будзе праводзіцца пры прэзідэнце Дональдзе Трампе, тады як Барак Абама якраз меў намер дабіцца сілай адхілення ад улады Асада.

На думку аналітыкаў, хоць пазіцыі ў Сірыі Асада і аслабелі ў нейкі момант, цяпер ён выглядае больш упэўненым, бо забяспечыў сабе падтрымку з боку Расіі, асабліва — ваенную.

## Чвэрць расіян лічыць, што Сонца круціцца вакол Зямлі

Кожны чацвёрты жыхар Расіі перакананы, што гэта Сонца круціцца вакол Зямлі, а не наадварот. Пра гэта паведамляе газета «Известия» са спасылкай на словы Валерыя Фёдарава, гендырэктара Усерасійскага цэнтра вывучэння грамадскай думкі.

«Па даных апытання, чвэрць расіян верыць у тое, што не Зямля круціцца вакол Сонца, а Сонца вакол Зямлі. Гэта сацыялагічны факт, які мы выявілі, затым пераправерылі і зноў пацвердзілі», — сказаў Валерый Фёдараў.

Кіраўнік цэнтра прызнаўся, што быў уражаны адказам часткі сваіх суайчыннікаў на гэтае пытанне. Ён не ўдакладніў, як шмат людзей было апытана і калі праходзіла даследаванне.

У 2011 годзе паведамлялася аб выніках падобнага даследавання. Тады аб вярчэнні Сонца вакол Зямлі сказала трэць рэспандэнтаў (32%). Таксама 11% апытаных былі ўпэўненыя, што радыеактыўнае малако можна зрабіць бяспечным, калі яго проста пракіпяціць.

■ Фінансы

# СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ — 14%

**Зніжэнне стаўкі рэфінансавання з 15% да 14% гадавых у Беларусі адбудзецца з 19 красавіка, паведамляюць спецыялісты ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка краіны.**

Таксама з гэтай даты зніжаюцца і стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях Нацбанка па падтрымцы бягучай ліквіднасці банкаў — з 18% да 17% гадавых. Акрамя таго, зніжаны стаўкі па пастаянна даступных аперацыях выключэння ліквіднасці — з 10% да 9% гадавых. «Інфляцыя ў Беларусі працягвае зніжацца больш значнымі тэмпамі, чым прагназавалася. Такая тэндэнцыя ў асноўным абумоўлена паслабленнем інфляцыйнага ціску з боку фундаментальных і манетарных фактараў. Прырост спажывецкіх цэн, а таксама паказчыкі базавай і трэндавай інфляцыі сёлета ў сакавіку і ў найбліжэйшыя месяцы чакаюцца на ўзроўні менш за 7 працэнтаў у гадавым падліку», — растлумачылі ў Нацбанку.

Фінансісты адзначаюць, што на ўнутраным валютным рынку захоўваецца тэндэнцыя чыстай прапановы замежнай валюты, што забяспечвае ўстойлівасць курсу беларускага рубля і дазваляе Нацыянальнаму банку купляць валюту для папаўнення золатавалютных рэзерваў. Эканамісты прагназуюць, што Нацыянальны банк будзе і надалей зніжаць сёлета працэнтныя стаўкі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

■ Абітурыент-2017

# ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ СТАРТУЕ НА ЧАТЫРЫ ДНІ ПАЗНЕЙ

**Міністэрства адукацыі вызначылася з тэрмінамі падачы дакументаў у прыёмныя камісіі і залічэння абітурыентаў. У галоўным адукацыйным ведамстве растлумачылі нюансы будучай уступнай кампаніі, якія з'явіліся пасля ўнясення змяненняў у Правілы прыёму.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Так, у сувязі з увядзеннем чацвёртай дысцыпліны на ЦТ і трох рэзервовых дзён для здачы тэсціравання (замест аднаго, які быў раней), тэрміны пачатку прыёму дакументаў на бюджэтную форму навучання пасунуліся на чатыры дні. Прыёмныя камісіі будуць прымаць у абітурыентаў дакументы з 12 па 17 ліпеня (летась прыём дакументаў на «бюджэт» распачынаўся 8 ліпеня).

А з 18 ліпеня распачынаюцца ўступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаны тэрмін навучання. Уступныя іспыты арганізаваны толькі ў адну сесію: як для асоб, што паступаюць за кошт сродкаў бюджэту, так і на платнай аснове.

Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ, дакументы будуць прымаца:

з 12 па 31 ліпеня — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

з 12 ліпеня па 2 жніўня — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

з 12 ліпеня па 4 жніўня — ва ўсіх іншых установах вышэйшай адукацыі.

Выпускнікі профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці, павінны падаць свае дакументы з 12 па 14 ліпеня.

Тэрміны падачы дакументаў для выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці пасля праходжання гутаркі — з 12 па 14 ліпеня (як для асоб, якія паступаюць на «бюджэт», так і на платнай аснове).

Уступныя выпрабаванні пройдуць у наступныя тэрміны:

з 18 па 21 ліпеня — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

з 18 па 26 ліпеня — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

з 18 па 24 ліпеня — у іншых ВНУ.

Тэрміны залічэння на «бюджэт» наступныя: па 24 ліпеня — у ВНУ сілавых ведамстваў, па 28 ліпеня — у творчых, сельскагаспадарчых і іншых ВНУ.

Прыём дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору будзе весціся ў ВНУ сілавых ведамстваў — з 26 па 28 ліпеня (залічэнне па 30 ліпеня), у творчых ВНУ — з 29 па 30 ліпеня (залічэнне па 1 жніўня ) і ў сельскагаспадарчых і іншых ВНУ — з 30 ліпеня па 1 жніўня (залічэнне па 3 жніўня).

Тэрміны залічэння на платную форму навучання ў ВНУ сілавых ведамстваў — па 2 жніўня, у творчых ВНУ — па 3 жніўня, у сельскагаспадарчых і іншых ВНУ — па 6 жніўня.

Пастановай Міністэрства адукацыі таксама рэгламентаваны тэрміны прыёму дакументаў, правядзення гутаркі і залічэння на вакантныя месцы на «бюджэт» і на платнай аснове грамадзян Луганскай і Данецкай абласцей Украіны. Яны змогуць удзельнічаць у конкурсе на бюджэтныя вакантныя месцы ў рамках дадатковага набору адначасова з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. У конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі на ўмовах аплаты па выніках гутаркі грамадзяне Луганскай і Данецкай абласцей змогуць удзельнічаць па 15 кастрычніка.

Міністэрства адукацыі зацвердзіла пералік міжнародных алімпіяд, пераможцы якіх будуць мець у бягучым годзе права на залічэнне без уступных выпрабаванняў у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на адпаведныя спецыяльнасці. Без экзаменаў змогуць паступаць абітурыенты, якія атрымалі ў гэтым годзе дыпломы I, II і III ступеняў на 58-й Міжнароднай матэматычнай алімпіядзе (Бразілія), 51-й Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе школьнікаў па хіміі (Казахстан), 49-й Міжнароднай хімічнай алімпіядзе (Тайланд), 48-й Міжнароднай фізічнай алімпіядзе (Інданезія), 29-й Міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы (Іран), 28-й Міжнароднай біялагічнай алімпіядзе (Вялікабрытанія), 14-й Міжнароднай геаграфічнай алімпіядзе (Сербія), 6-й Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе для дзяўчат (Швейцарыя), 11-й Міжнароднай алімпіядзе па навуках аб Зямлі (Францыя), 13-й Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіядзе па фізіцы, матэматыцы і інфарматыцы (Казахстан). На залічэнне без уступных выпрабаванняў маюць права і пераможцы алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы па рускай мове і літаратуры «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства», якая праводзілася восенню 2016 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

# «Тыдзень лесу — 2017»

**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама, заклікае жыхароў вобласці прыняць удзел у Тыдні лесу, які пачаўся 1 красавіка. Аб гэтым было заяўлена на прэс-канферэнцыі для прадстаўнікоў СМІ ў Воранаве.**

— Гэта той скарб, які застанецца і для нашых нашчадкаў, — зазначыў гродзенскі губернатар. — На выхадных на пасадкі лесу выйдуць прадстаўнікі розных арганізацый, чыноўнікі, у тым ліку і кіраўніцтва аблвыканкама. Нашы жыхары заўсёды актыўна падтрымліваюць такія акцыі, спадзяюся, што і гэтым разам яны прымуць актыўны ўдзел у рэспубліканскім Тыдні лесу, бо гэта не толькі карысная, але і цікавая справа.

Плануецца высадзіць каля 2 тысяч саджанцаў розных парод дрэў, азеляніць прыдарожныя тэрыторы, навесці парадак ў лесе. Работа ў гэтым кірунку працягнецца і падчас рэспубліканскага суботніка. Уладзімір Краўцоў падкрэсліў, што частка сродкаў, сабраных падчас акцый, пойдзе на стварэнне ў Гродне паліятыўнага цэнтра, дзе будуць аказваць дапамогу дзеткам, якія патрабуюць пастаяннага дагляду.

— Нам даўно патрэбен падобны аб'ект, — растлумачыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама. — Цяпер такі цэнтр існуе ў рамках абласной бальніцы. Мы плануем арганізаваць яго на базе Дома дзіцяці, што дазволіць разгрузіць аддзяленне рэанімацыі. Мяркую, што ўдзел нашых жыхароў у Тыдні лесу і суботніку дапаможа сабраць неабходныя для гэтага сродкі.

* * *

Пра свой удзел у акцыі «Тыдзень лесу», якая праходзіць па ўсёй краіне, ужо заявілі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, апарат Савета Рэспублікі, калектывы міністэрстваў энергетыкі, надзвычайных сітуацый, антыманапольнага рэгулявання і гандлю, сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, спорту і турызму, памежнага і следчага камітэтаў, Нацыянальнага банка, апарат Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і многія іншыя. Лясгасы краіны падрыхтавалі больш за 900 аб'ектаў па ўсёй краіне.

У спецыяльным раздзеле на сайце міністэрства размешчаны кантактныя тэлефоны і спісы аб'ектаў, якія прапануюцца для ўдзельнікаў акцыі: https://www.mlh.by/press-service/actual/867/.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*
**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ З нагоды

# «АЎТАЗАВОДЦУ» — 70

З канвеера зборачнай вытворчасці Мінскага аўтамабільнага завода яшчэ не сышла ні адна машына з фірмовым «зубрам» на капоце, калі ў першыя цэхі прадпрыемства, якія выраслі літаральна на ўчорашніх пустках, 1 красавіка 1947 года прыйшоў першы нумар «шматтыражкі» завода, — дзве малафарматныя старонкі. «Аўтазаводзец» стаў першай заводской шматтыражнай газетай у пасляваенным Мінску.

1 красавіка 1972 года — выпушчана 3000 нумароў «шматтыражкі», «Аўтазаводзец» адзначыў сваё 25-годдзе — газета ўзнагароджана Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Міністэрства аўтамабільнай прамысловасці і ЦК ЛКСМБ. А ў маі «Аўтазаводзец» удастоены ўсесаюзнай прэміі «За найлепшую пастаноўку масавай работы ў рэдакцыі».

З 2010 года пачаўся, па сутнасці справы, новы перыяд развіцця выдання ва ўсім свеце прадпрыемства і, натуральна, заводской «шматтыражкі». Усё больш увагі ўдзяляецца сацыяльнай сферы, паляпшэнню ўмоў працы рабочых. У той жа час на першым месцы застаецца задача выпуску новай тэхнікі — надзейнай, якаснай. І, вядома, усе гэтыя падзеі знаходзяць сваё адлюстраванне на старонках «Аўтазаводца», журналісты якога ніколі не застаюцца ў баку ад праблем, задач і поспехаў усяго калектыву флагмана беларускага аўтамабілебудавання.

Віншуем калег з адметнай датай!

**Алесь ДРАЎНІЦКІ**

■


УНП 300083521

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
ОАО «Технолит Полоцк»
на 31 декабря 2017 г.

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | 190 | 7 405 | 7 499 |
| II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | 290 | 3 742 | 6 731 |
| Баланс | 300 | 11 147 | 14 230 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за январь – декабрь 2016 г.

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2016 года | За январь – декабрь 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 2 346 | 2 030 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (2 606) | (2 618) |
| Расходы на реализацию | 050 | (34) | (43) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | (771) | (1 335) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 1 034 | 560 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (1 244) | (906) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (+-060+070-080) | 090 | (981) | (1 681) |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (257) | (53) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130) | 140 | (52) | 19 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (+-090+-140) | 150 | (1 033) | (1 662) |
| Налог на прибыль | 160 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (+-150-160+-170+-180-190-200) | 210 | (1 033) | (1 662) |

| Наименование показателей | Ед. измер. | За отчетный период | За аналог. период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов | млн руб. | - | - |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 1,34 | 3,4 |

Среднесписочная численность работающих (человек) – 211.

Директор А.М. Александров
Гл. бухгалтер Ж.В. Хорак


■ Здарэнні

# БЕЛАРУСКІЯ АЎТОБУСЫ ТРАПІЛІ Ў АВАРЫІ ВА УКРАІНЕ І ЛІТВЕ

**У Львоўскай вобласці рэйсавы аўтобус Мінск — Букавель сутыкнуўся з аўтамабілем. Два чалавекі загінулі. Рэйс быў беларускім.**

Пасольства Беларусі ва Украіне кантралюе ход расследавання, удакладняе спіс пацярпелых, абставіны ДТЗ. Задзейнічаны ганаровы консул у Львове. Аварыя адбылася ў 6.30 раніцы каля вёскі Пятнічаны Жыдачаўскага раёна. Паводле інфармацыі МЗС, у аўтобусе, што трапіў у ДТЗ, знаходзіліся 42 пасажыры. У выніку сутыкнення аўтобуса з легкавым аўтамабілем два чалавекі загінулі. Адзін з іх — кіроўца легкавіка, грамадзянін Украіны. Звесткі па другім загінулым удакладняюцца. Шпіталізаваны 12 чалавек з траўмамі рознай ступені цяжкасці. Сярод іх есць і цяжкія.

А ў Літве аўтобус з беларускімі дзецьмі з'ехаў з дарогі. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Здарэнне адбылося ў Панявежскім раёне на аўтамагістралі Вільнюс — Панявежыс у 5.45. У аўтобусе ехала каля 20 дзяцей. Па інфармацыі пасольства Беларусі ў Літве, пашкоджанні атрымала толькі пярэдняя частка аўтобуса. Прычынай ДТЗ стала слізкая дарога і няўважлівасць кіроўцы. Дзяцей напачатку правялі да найбліжэйшай гасцініцы, а затым яны прадоўжылі рух па маршруце ў Літве на іншым аўтобусе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

■ На кантролі

# «ЗДАВАЙЦЕ ЗБРОЮ!»

## З 3 па 7 красавіка ў краіне пройдзе аперацыя «Арсенал»

**Шэраг мерапрыемстваў будзе накіраваны на выяўленне незаконнага захоўвання зброі, боепрыпасаў, выбуховых прылад і рэчываў. Акрамя таго, супрацоўнікі міліцыі сумесна з прадстаўнікамі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і іншых прыродаахоўных арганізацыяй будуць праводзіць рэйды па прадухіленні фактаў браканьерства.**

Па словах **старшага інспектара па асаблівых даручэннях аддзела ліцэнзійна-дазвольнай работы ўпраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Дзмітрыя ЯЗЭПЧЫКА**, толькі за мінулы год было канфіскавана больш за 1100 адзінак незарэгістраванай зброі, у сувязі з гэтым узбуджана 661 крымінальная справа. Тыя, хто здае зброю добраахвотна, вызваляюцца як ад адміністрацыйнай, так і ад крымінальнай адказнасці: летась так было атрымана больш за тысячу адзінак зброі.

У межах акцыі «Арсенал» будуць адпрацоўваць як уладальнікі зброі, якія стаяць на ўліку (у іх будуць правяраць парадак захоўвання зброі і наяўнасць усіх неабходных дакументаў), так і патэнцыйных парушальнікаў. Дарэчы, самастойная «мадэрнізацыя» канструкцыі таксама забаронена.

**Начальнік упраўлення аналізу і кантролю за аховай і выкарыстаннем аб'ектаў жывёльнага і расліннага свету Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Аляксандр ДРАГУН** адзначыў, што асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца фактам незаконнага палявання: без дазволу, з ужываннем незарэгістраванай зброі, непадыходзячымі прыладамі і спосабамі. Летась супрацоўнікі Дзяржаўнай інспекцыі канфіскавалі 544 адзінкі незарэгістраванай зброі, у тым ліку 142 падчас незаконнага палявання. Калі зарэгістраваны сур'ёзныя парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства, чалавек у любым выпадку пазбаўляецца права на захоўванне зброі і на паляванне.

Што датычыцца навaўвядзенняў у згаданай сферы, то з 26 красавіка гэтага года кожны чалавек пры падаўжэнні дазволу на захоўванне зброі, што неабходна рабіць раз у тры гады, абавязаны будзе прад'яўляць свежую медыцынскую даведку. Акрамя таго, перамены закрануць і рэалізацыю вырабаў, канструкцыйна падобных да пнеўматычнай зброі, але з дульнай энергіяй да трох джоўляў, якія цяпер знаходзяцца ў адкрытым доступе. Унесена прапанова аб забароне іх продажу непаўналетнім.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■

■ Вучнёўскі гардэроб

# ФОРМА ДЛЯ ВЫДАТНІКАЎ І ХУЛІГАНАЎ

## Беллегпрам прадставіў новыя калекцыі школьнага адзення

**Да наступнага сезона канцэрн падрыхтаваў каля 500 мадэляў адзення для вучняў. У параўнанні з мінулым годам асартымент абнавілі на 90 працэнтаў. Намеснік старшыні Беллегпрама Аляксандр ЯКОЎЧЫЦ адзначыў, што калекцыі ствараліся па капсульным метадзе — гэта значыць швейныя вырабы можна лёгка камплектаваць адно з адным. Плюс дызайнеры фабрык зрабілі стаўку не толькі на экалагічна чыстыя тканіны, але і на адпаведнасць модзе.**

Апошняе прыемна радуе. Калі гадоў пяць таму школьнае адзенне прызначалася быццам бы толькі для выдатнікаў на ўрачыстай лінейцы, то цяпер беларускія вытворцы пастараліся прадставіць разнапланавую форму, у якой камфортна сябе будзе адчуваць і ўзорны вучань, і «сарвігалава».

Новыя калекцыі прадставілі падчас паказу, які праходзіў у рамках выстаўкі «БелТЭКСлегпрам. Вясна — 2017». Так, фабрыка «Славянка» распрацавала некалькі кірункаў дзелавога стылю для школьнікаў: «высакародны шэры», «лэдзі ў чорным», «джынсавы стыль», «сіні дыпламат», «натуральная лінія», «камфортны трыкатаж». Кожны кірунак ахоплівае ўсе ўзроставыя групы і ўключае адзенне для поўных дзяцей. З цікавых мадэляў для дзяўчатак — надзвычай модная цяпер спадніца-плісэ і сукенка з белымі каўнерыкам і манжэтамі ў стылі «рэтра».

Прадпрыемства «Калінка» прэзентавала форму, у якой дзеці будуць адчуваць сябе камфортна і ў працэсе заняткаў, і падчас адпачынку на перапынках. Для школьніц, якім надакучылі простыя фасоны, пашылі блузы з аборкамі і пінжакі з высокімі плячыма. Навагрудская фабрыка «БелКрэда» выпусціла калекцыю «Разумнікі і разумніцы», выробленую з паўшарсцяных і полівіскозных тканін высокай якасці. Паклапаціліся і аб аксесуарах: дзяўчаткам прапануюць дапоўніць свой вобраз гальштукамі, а хлопчыкам — матылькамі.

Базавыя рэчы дзелавога стылю прадставіла Жлобінская швейная фабрыка. Касцюм для хлопчыкаў складаецца з пінжака, камізэлькі і штаноў, а касцюм для дзяўчатак уключае жакет, спадніцу, сарафан і блузку. Навінкай калекцыі сталі трыкатажныя бомберы — цёплыя і зручны варыянт на кожны дзень (прычым не толькі для школы).

Мазырскае прадпрыемства «Надэкс» распрацавала да наступнага навучальнага года вялікі асартымент блуз — з рушамі, валанамі, атласнымі стужкамі. Ёсць варыянты як для паўсядзённых заняткаў, так і для экзаменаў і ўрачыстых мерапрыемстваў. Кашулі для хлопчыкаў пашыты ў класічным стылі.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.







Практычныя джэмперы і камізэлькі з якаснага матэрыялу падрыхтавала трыкатажная фабрыка «Палессе». Новая лінія адзення для вучняў «Дзелавашкі» выканана ў тыповых школьных колерах: шэрым, сінім, бардо. А для вучаніц выпускных класаў строгія камплекты шукайце на фабрыцы «Вяснянка» (Магілёў). Тут ёсць і шыфонавыя блузы, і чырвоныя касцюмы, і ўкарочаныя штаны.

Што да спартыўнай формы, то аб гэтым паклапаціліся прадпрыемствы «8 Сакавіка» і «Світанак».

Частка з прадстаўленага адзення ўжо паступіла ў крамы, але актыўны перыяд продажаў пачнецца ў маі. З новымі калекцыямі на паказе азнаёміліся і прадстаўнікі навучальных устаноў, каб ужо цяпер заказаць адзіную форму для асобных класаў у рамках праекта «Школа будучыні». Летась у гэтым праекце ўдзельнічалі 38 школ (у тры разы больш, чым планавалася) і 12 тысяч дзяцей. У наступным навучальным годзе, упэўнены ў Беллегпраме, заказы на форму пакіне яшчэ больш устаноў адукацыі: попыт адназначна расце.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Разумныя грошы

# АБ ФІНАНСАХ У ФАРМАЦЕ БРЭЙН-РЫНГА

## Больш за 130 школьнікаў сталіцы прынялі ўдзел у інтэлектуальнай гульні ад Беларусбанка

**Гэтым разам чарговая інтэлектуальная гульня для старшакласнікаў Мінска была арганізавана па фінансавай тэматыцы «Вучыся. Зберагай. Зарабляй». Мерапрыемства было праведзена падчас Тыдня фінансавай адукаванасці дзяцей і моладзі (Global Money Week), які сёлета праходзіць у нашай краіне з 27 сакавіка па 2 красавіка.**

Гульня па фінансавай тэматыцы для старшакласнікаў сталіцы праходзіла ў межах клуба Беларусбанка «Плацінавая Сава», які пачаў сваю работу ў студзені 2017 года. Дарэчы, гульні клуба для супрацоўнікаў банка праводзяцца кожную трэцюю пятніцу месяца ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі. А вось падобнае сур'ёзнае мерапрыемства для вучняў праводзілася ўпершыню. Арганізавала яе наша найбуйнейшая фінансавая ўстанова сумесна з Міністэрствам адукацыі на тэрыторыі Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. Ва ўпартай барацьбе, бо для вызначэння пераможцаў спатрэбіліся дадатковыя раўнды, першае месца заняла гімназія №39. Другой стала каманда гімназіі №7, трэцяе месца — у гімназіі №56.

«Пры падрыхтоўцы да Тыдня фінансавай адукаванасці дзяцей і моладзі мы шукалі новыя падыходы ў правядзенні мерапрыемстваў для школьнікаў, — адзначыў **начальнік упраўлення інфармацыі і сацыяльнага развіцця Беларусбанка Дзмітрый БАКІНОЎСКІ**. — Сённяшняя гульня — адзін з такіх яркіх прыкладаў. Банк прапанаваў вучням у інтэрактыўнай форме праверыць свае веды ў галіне фінансаў, і яны адгукнуліся. Паспаборнічаць прыехалі 23 каманды з усіх раёнаў горада Мінска. Пераможцы атрымалі не толькі станоўчыя эмоцыі і каштоўныя прызы, але і магчымасць прыняць удзел у наступнай гульні турніру работнікаў нашага банка «Разам мы Розум».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


РУП «Белпочта» объявляет о проведении переговоров по выбору подрядной организации для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте **«Текущий ремонт общежития РУП «Белпочта» и ямочный ремонт прилегающей территории по ул. Кульман, 21 в г. Минске».**

Процедура переговоров состоится 5 апреля 2017 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10. Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел. 293-55-29.

УНП 101015738



СТРАХОВАЯ КОМПАНИЯ ПРОМТРАНСИНВЕСТ

**СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ**

**«СЧАСТЛИВЫЙ ПОЛИС»**

Наименование Организатора: Закрытое акционерное страховое общество «Промтрансинвест».
Местонахождение Организатора: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7а, 6-й этаж.
Учетный номер плательщика: 100357923.
Наименование Рекламной игры: «Счастливый полис».
Сведения о территории проведения Рекламной игры: Республика Беларусь.
Срок начала Рекламной игры: 1 октября 2016 года.
Срок окончания Рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Рекламной игры: 30 апреля 2017 года.
Сведения о государственной регистрации Рекламной игры: свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры №2826 от 15 сентября 2016 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.
Количество участников рекламной игры: 1305 человек (1441 договор).
Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда: призовой фонд разыгран полностью.

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Поплавный С.З. | Телевизор Samsung UE48J5200AU на сумму 1 278,99 бел. руб. и денежная сумма в размере 176,32 бел. руб. |
| 2 | Яковец С.В. | Телевизор Samsung UE48J5200AU на сумму 1 278,99 бел. руб. и денежная сумма в размере 176,32 бел. руб. |
| 3 | Матюшенко Г.В. | Телевизор Samsung UE48J5200AU на сумму 1 278,99 бел. руб. и денежная сумма в размере 176,32 бел. руб. |
| 4 | Куряков А.Ф. | Холодильник с морозильником ATLANT XM 4423-000 N на сумму 755 бел. руб. и денежная сумма в размере 98,02 бел. руб. |
| 5 | Егомостев Ю.Л. | Холодильник с морозильником ATLANT XM 4423-000 N на сумму 755 бел. руб. и денежная сумма в размере 98,02 бел. руб. |
| 6 | Микушко С.В. | Холодильник с морозильником ATLANT XM 4423-000 N на сумму 755 бел. руб. и денежная сумма в размере 98,02 бел. руб. |
| 7 | Цыганок В.П. | Холодильник с морозильником ATLANT XM 4423-000 N на сумму 755 бел. руб. и денежная сумма в размере 98,02 бел. руб. |
| 8 | Ермаченкова Т.А. | Холодильник с морозильником ATLANT XM 4423-000 N на сумму 755 бел. руб. и денежная сумма в размере 98,02 бел. руб. |
| 9 | Молчанов Ю.А. | Посудомоечная машина Indesit DISR 14B на сумму 513,82 бел. руб. и денежная сумма в размере 61,98 бел. руб. |
| 10 | Старикова В.В. | Посудомоечная машина Indesit DISR 14B на сумму 513,82 бел. руб. и денежная сумма в размере 61,98 бел. руб. |
| 11 | Ковальчук В.В. | Посудомоечная машина Indesit DISR 14B на сумму 513,82 бел. руб. и денежная сумма в размере 61,98 бел. руб. |
| 12 | Селицкая И.М. | Посудомоечная машина Indesit DISR 14B на сумму 513,82 бел. руб. и денежная сумма в размере 61,98 бел. руб. |
| 13 | Носко С.И. | Посудомоечная машина Indesit DISR 14B на сумму 513,82 бел. руб. и денежная сумма в размере 61,98 бел. руб. |
| 14 | Дручек М.И. | Пылесос Samsung VCMA16BS (VC16BSNMAUB/EV) на сумму 167 бел. руб. и денежная сумма в размере 10,16 бел. руб. |
| 15 | Шевчик Д.И. | Пылесос Samsung VCMA16BS (VC16BSNMAUB/EV) на сумму 167 бел. руб. и денежная сумма в размере 10,16 бел. руб. |
| 16 | Гурина Н.В. | Пылесос Samsung VCMA16BS (VC16BSNMAUB/EV) на сумму 167 бел. руб. и денежная сумма в размере 10,16 бел. руб. |

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 17 | Зеньков О.В. | Пылесос Samsung VCMA16BS (VC16BSNMAUB/EV) на сумму 167 бел. руб. и денежная сумма в размере 10,16 бел. руб. |
| 18 | Шаповалов Ф.Ф. | Пылесос Samsung VCMA16BS (VC16BSNMAUB/EV) на сумму 167 бел. руб. и денежная сумма в размере 10,16 бел. руб. |
| 19 | Прудник О.А. | Пылесос Samsung VCMA16BS (VC16BSNMAUB/EV) на сумму 167 бел. руб. и денежная сумма в размере 10,16 бел. руб. |
| 20 | Суворова О.С. | Пылесос Samsung VCMA16BS (VC16BSNMAUB/EV) на сумму 167 бел. руб. и денежная сумма в размере 10,16 бел. руб. |
| 21 | Гидревич И.А. | Пылесос Samsung VCMA16BS (VC16BSNMAUB/EV) на сумму 167 бел. руб. и денежная сумма в размере 10,16 бел. руб. |
| 22 | Шашолко И.И. | Пылесос Samsung VCMA16BS (VC16BSNMAUB/EV) на сумму 167 бел. руб. и денежная сумма в размере 10,16 бел. руб. |
| 23 | Корешков М.В. | Сотовый телефон Apple IPHONE 6 SILVER 16GB, MODEL A1586, MG482RM/A на сумму 1 461,99 бел. руб. и денежная сумма в размере 203,67 бел. руб. |
| 24 | Лешкевич Т.С. | Сотовый телефон Apple IPHONE 6 SILVER 16GB, MODEL A1586, MG482RM/A на сумму 1 461,99 бел. руб. и денежная сумма в размере 203,67 бел. руб. |
| 25 | Бриштель А.И. | Сотовый телефон Apple IPHONE 6 SILVER 16GB, MODEL A1586, MG482RM/A на сумму 1 461,99 бел. руб. и денежная сумма в размере 203,67 бел. руб. |
| 26 | Илькевич О.Н. | Сотовый телефон Apple IPHONE 6 SILVER 16GB, MODEL A1586, MG482RM/A на сумму 1 461,99 бел. руб. и денежная сумма в размере 203,67 бел. руб. |
| 27 | Шипунов В.В. | Сотовый телефон Apple IPHONE 6 SILVER 16GB, MODEL A1586, MG482RM/A на сумму 1 461,99 бел. руб. и денежная сумма в размере 203,67 бел. руб. |
| 28 | Бамбиза В.А. | Планшет Lenovo Yoga Tab 3 X50M 16GB LTE (ZA0K0025UA) на сумму 596,48 бел. руб. и денежная сумма в размере 74,34 бел. руб. |
| 29 | Шедько В.И. | Планшет Lenovo Yoga Tab 3 X50M 16GB LTE (ZA0K0025UA) на сумму 596,48 бел. руб. и денежная сумма в размере 74,34 бел. руб. |
| 30 | Петрашко И.П. | Планшет Lenovo Yoga Tab 3 X50M 16GB LTE (ZA0K0025UA) на сумму 596,48 бел. руб. и денежная сумма в размере 74,34 бел. руб. |

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 (17) 213 15 51.**

■ Памяць сэрца

# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ АД ВЕТЭРАНА

## Былы авіятар з Магілёва два гады сістэматызаваў інфармацыю па Героях Савецкага Саюза

**Гэта кніга ўнікальная ўжо тым, што дагэтуль ніхто так не групаваў Герояў Савецкага Саюза. Аўтар падзяляе іх па родах войскаў, узросце, грамадзянстве і нават поле. Акрамя аўтабіяграфічных звестак па кожным ёсць яшчэ і невялікая інфармацыя пра подзвіг. Кніга напалову напісана ад рукі. Астатняе — выразкі з перыядычных выданняў і ксеракопіі фотаздымкаў. Сабраць у адзін важкі том гэтыя разнастайныя матэрыялы дапамагла магілёўская абласная газета «Зямля і людзі», з якой ужо доўгі час сябруе ветэран.**



Глядзіш на незвычайную энцыклапедыю і здзіўляешся, якая ж карпатлівая работа была зроблена. Інфармацыю па Героях Савецкага Саюза Іван Мацвееў збіраў даўно, але мэтанакіравана пачаў працаваць над кнігай толькі два гады таму. У сакавіку ветэрану Ваенна-паветраных сіл споўніўся 91 год. Прызнаецца, што калі стала цяжка ездзіць на дачу, знайшоў сабе іншы занятак. Хадзіў па бібліятэках і збіраў карысны матэрыял. Суразмоўца аптыміст і не страціў цікавасці да жыцця. Прыемна здзіўляе фенаменальнай памяццю. «Вось колькі Герояў Савецкага Саюза было за перыяд савецкай улады? — застае ён мяне знянацку сваім пытаннем. «Каля 14 тысяч! Прычым за час Вялікай Айчыннай вайны званне прысвоена 13 611 чалавекам. Некаторым нават не аднойчы. Напрыклад, Іван Кажадуб у жніўні 1945 года стаў тройчы героем».

Пачынаецца кніга з аповеду пра лётчыкаў-чалюскінцаў, якія першымі атрымалі званне Герояў, потым — палярныя даследчыкі, Героі вызваленчай вайны ў Іспаніі, баёў на возеры Хасан, рацэ Халхін-Гол, савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гадоў, двойчы Героі Савецкага Саюза, Героі, рэпрэсіраваныя да вайны, жанчыны-Героі, Героі Савецкага Саюза да 18 гадоў, грамадзяне замежных краін, якія атрымалі гэта высокае званне...

— Інфармацыя пра Герояў не закрытая, у чым жа навізна вашай працы? — спрабую зразумець матыў стварэння гэтага выдання.

— Вы ў руках энцыклапедыю Герояў Савецкага Саюза трымалі? Яны ж там ідуць па алфавіце, усе ў хаатычным парадку. А я іх па кватэрах разводзіў, па дамах, па гарадах, — усміхаецца ветэран. — Напрыклад, у Магілёве ёсць вуліца Каралёва. Хто такі? У мяне тут ёсць адказ: камандзір партызанскага злучэння, генерал-маёр. Партызаны ў мяне асобна сабраныя.

Гартаю старонкі. На вочы трапляюць фатаграфіі знакамітых «смелых» лётчыкаў-чалюскінцаў.

— Першымі Героямі Савецкага Саюза сталі Анатоль Ляпідзеўскі, Сігізмунд Леваневскі, Міхаіл Вадап'янаў, Мікалай Каманін, Іван Даронін, Маўрыкій Сляпнёў, Васіль Молакаў, — пералічвае ветэран кожнага пайменна. — Восьмым Героем стаў лётчык-выпрабавальнік Міхаіл Громаў. А Чкалаў атрымаў званне Героя Савецкага Саюза дзявятым — за свой рэкордна далёкі для таго часу пералёт — ад Масквы да Далёкага Усходу.

Героі Магілёўшчыны таксама сабраны асобна. І пад нумарам адзін значыцца вядомы савецкі матэматык, географ, геафізік, астраном, даследчык Паміра і Поўначы Ота Юльевіч Шміт. «Званне Героя ён атрымаў у 1937-м за арганізацыю дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс-1», — удакладняе аўтар кнігі. — Наогул асваенне паўночных зямель шмат каго зрабіла Героямі. Гэта званне прысвоена ўсяму экіпажу парахода «Сядоў», які дрэйфаваў 812 сутак. Нават, кухару. І наш магілёўчанін у той спіс трапіў — Іосіф Нядзвецкі. На «Сядове» ён быў машыністам. Трапіў туды ў ліку добраахвотнікаў, такіх знайшлося 15 чалавек. Толькі вярнуцца яму адтуль жывым не прыйшлося. Загінуў на пажары на Новы год. Па сваёй жа віне. Пахаваны ў Маскве».

— Дзе ў асноўным бралі інфармацыю пра Герояў? — цікаўлюся я.

— Па магілёўчанах — з кнігі «Гонар і Слава Магілёўшчыны», якую мне гарвыканкам падарыў перад Днём Перамогі. З кнігі «Іх імёнамі названы» даведаўся, што Рыма Шаршнёва, дзяўчына з Гомельшчыны, у 1942 годзе паўтарыла подзвіг Аляксандра Матросава. Але ёй Героя Савецкага Саюза не далі, узнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга. Калі мне было праці рухацца, ездзіў у бібліятэку імя Карла Маркса. Там сядзеў з энцыклапедыямі, выбіраў, запісваў. Выкарыстоўваў звесткі з тэлеперадач. Летась у адной з іх расказвалі пра мінчаніна, Героя Савецкага Саюза Васіля Мічурына. Ён як раз



Прызваннем Івана МАЦВЕЕВА стала авіяцыя.

адзначаў 100-гадовы юбілей. Героя атрымаў пасля «фінскай» вайны.

А вось з двойчы Героем Савецкага Саюза Сцяпанам Крэтавым Іван Рыгоравіч нават служыў у адным палку. «Ён вайну закончыў капітанам, а даслужыўся да камандзіра ракетнай часці, — кажа ветэран. — Другога Героя Савецкага Саюза яму прысвоілі 23 лютага 1948 года. За удзел у вайне. Як ён сам прызнаваўся: спіртное перашкаджала атрымаць яму зорку раней. Тады за гэта вельмі строга каралі».

Пра сябе ветэран расказвае, што на вайну трапіў як раз у Дзень Перамогі. У 41-м скончыў 7 класаў, а калі адвучыўся ў авіяцыйным вучылішчы, быў ужо 1945 год. Але служба ў Быхаве, куды яго ў хуткім часе накіравалі, таксама была не з лёгкіх. У савецкія гады тут базіравалася 57-я Смаленская марская ракетаносная авіяцыйная дывізія ВПС Балтыйскага флоту. «Атамныя бомбы вешаў на хвост і лятаў, — смяецца Іван Рыгоравіч. — Нават жонка не ведала, чым дакладна займаюся. Гэта ж быў сакрэтны аб'ект, адзіны такога роду аэрадром у Савецкім Саюзе».

На стале Івана Мацвеева ляжыць яшчэ некалькі папак. «Збіраю апошні матэрыял па Героях Савецкага Саюза да 18 гадоў», — тлумачыць ён. Ён марыць, што яго рукапісныя варыянты калі-небудзь надрукуюць. На сённяшні дзень іх існуе некалькі. Адзін мой суразмоўца перадаў у Магілёўскі гарадскі савет ветэранаў, яшчэ некалькі зрабіў на падарунак бібліятэкам імя Карла Маркса і дзіцячай №9, дзе браў асноўны матэрыял. Упэўнены: каму-небудзь гэта інфармацыя абавязкова спатрэбіцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Незвычайнае побач

# Падарункі зямлі і нябёсаў

## ЯКІЯ САКРЭТЫ АДКРЫЕ ГЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

**Дзе можна ўбачыць адзін з самых старажытных камянёў зямлі (якому каля 2 мільярдаў гадоў)? Між іншым дзякуючы шунгіту вучоныя зрабілі адкрыццё, што жыццё на нашай планеце ўзнікла раней, чым меркавалася, бо гэты камень біягеннага паходжання. Чаму б не даведацца, дзе на Беларусі прайшоў метэарытны дождж і не знайсці самы буйны (вагой каля 300 кг) камень, што ўпаў на нашу зямлю з неба? А яшчэ можна паглядзець на косткі мамантаў, шарсцістага насарога, паўночнага аленя, што былі знойдзены на Беларусі. Дарэчы, падобныя знаходкі былі і ў сталіцы пры пабудове метро.**

Калі пра парк камянёў сёння ведаюць многія, на жаль, пра геалагічны музей, што размяшчаецца побач, на базе Навукова-вытворчага цэнтра па геалогіі (Купрэвіча, 7), рэдка згадвае які настаўнік. Ды і тое, толькі калі ў межах школьнай праграмы вывучаецца тэма «карысныя выкапні». А дарэмна:



Як растуць камяні?



Алена МУРАТАВА паказвае, з якім мінералам знаёміцца немаўля.

па каменьчыках можна вывучаць і гісторыю, і знаёміцца з традыцыямі продкаў. З мінераламі мы сутыкаемся і карыстаемся імі кожны дзень. Напрыклад, слюда ўваходзіць у лак для пазногцяў і памаду, яна блішчыць на нашай вопратцы і навагодніх цацках, а некалі яе ставілі ў шыбы замест шкла.

У фондах музея, калекцыі якога збіраліся некалькімі пакаленнямі геолагаў, каля 6 тысяч узораў. Прычым тут можна ўбачыць не толькі беларускі матэрыял, але і пазнаёміцца з мінераламі і горнымі пародамі свету. Сярод экспанатаў ёсць вельмі рэдкія. Напрыклад, зялёны нефрыт (падобных па якасці камянёў у прыродзе ўжо не засталося) ці чараіт (адзінае радовішча якога ў свеце амаль выпрацаванае).

Сабрана і добрая калекцыя метэарытаў. І каля кожнай вітрыны адкрываюцца таямніцы, звязаныя з каменьчыкамі. Ці ведаеце вы, што булатная сталь рабілася з метэарытнага жалеза, што ў Аляксандра Македонскага была карона, створаная з «зоркі» і што дзякуючы метэарытам рабіліся розныя навуковыя адкрыцці? Напрыклад, вучоныя больш даведаліся пра космас (некаторыя метэарыты ўзніклі ў той час, што і Сонца), атрымалі падказку, як зрабіць штучныя алмазы. Дарэчы, ёсць у музеі і калекцыя лжэметэарытаў, якія перадаваліся геолагам, — за «падарункі з космасу» людзі прымалі балотную руду, фабрычныя шлакі і нават асколкі ад снарадаў часоў Першай сусветнай вайны.

І безумоўна, тут можна даведацца пра розныя карысныя выкапні, што здабываюцца на нашай зямлі, а таксама пра радовішчы, якія чакаюць сваіх інвестараў. Між іншым, сярод гэтых радовішчаў ёсць і бурштынавыя.

Міжволі задумаешся: і чаму ў сучаснай школьнай праграме няма такіх заняткаў ці хоць бы тэкстаў у падручніках, каб абуджаць у дзяцей цікавасць да геалогіі? І гэта пры тым, што многія рэчы, якімі мы карыстаемся, здабыты з зямлі. З чаго зроблены фарбы, алоўкі (графітны стрыжань), вопратка (сінтэтычная — з выкарыстаннем нафты). Які першы мінерал, з якім знаёміцца немаўля адразу пасля нараджэння (тальк).

Які камень самы мяккі — цвёрды (тальк — алмаз), цяжкі — лёгкі (пемза вулканічная — плаціна). Якія беларускія выкапні выкарыстоўваліся пры пабудове залатога палаца ў Версалі (вохра). Як выглядае гіпс? Ці былі такія часы, калі соль каштавала як золата?.. Хіба не з такіх простых пытанняў і адказаў абуджаецца цікавасць да навакольнага свету? І добра, калі гэта ўсё яшчэ можна пагладзець і памацаць.

***— А ці праўда, што камяні растуць?*** — спрабую знайсці адказ на пытанне, якое некалі, маленькай дзяўчынкай, задавала сваім бацькам.

— Камяні растуць незаўважна для нашых вачэй, — кажа **загадчыца музея Алена МУРАТАВА** і паказвае агат. — Калі гэты камень разрэзалі, унутры ў яго была поласць, дзе можна ўбачыць крышталікі кварцу. Гэта якраз паказвае, як камень вырас: спачатку была абалонка, а пасля яна пачала зарастаць усярэдзіне. У нас ёсць апалхацэдонавае дрэва. Драўніна згнівала, а па яе кольцах раслі мінералы групы кварцу. У нашым музеі можна ўбачыць і дрэва, якое абрасло крышталямі каменнай солі. Вырошчваць крышталі можна і ў хатніх умовах — пра дослед з соллю сёння мала хто не ведае.

***— У беларускіх легендах гаварылася, што камяні маглі вырастаць велічынёй з чалавека ці нават з хату...***

— Гэтыя легенды звязаны з ледавіковымі валунамі. Людзі, калі аралі зямлю, збіралі камяні, а на наступны год поле зноў было ўсыпана імі. Недзе дождж прайшоў — камень з зямлі вылез. Ды і ў самой зямной кары адбываюцца геалагічныя працэсы. Што датычыцца вялікіх валуноў, яны ўсе не нашыя, іх прыцягнулі ледавікі. Па каменьчыках-узорах у музеі можна даведацца пра «камяні-падарожнікі» і нават прасачыць, з якой краіны яны да нас прыбылі.

Знаёміць з «зямнымі скарбамі» можна нават у дзіцячых садках. Тым больш што пясок і гліна, з якімі возіцца малеча, — гэта ўжо прадмет для маленькага даследавання.

І гэта я яшчэ не згадала вялізныя косткі і зубы маманта і рэшткі іншых жывёл, што вымерлі мільёны гадоў таму. Дзіўна, што неблагая палеанталагічная калекцыя, сабраная беларускімі геолагамі, да апошняга часу заставалася без належнай увагі. З мінулага года большая частка палеанталагічных знаходак адсюль пачала паспяхова выстаўляцца ў Музеі гісторыі горада Мінска.

Калі разумееш, колькі розных адкрыццяў дзеці самага рознага ўзросту могуць зрабіць у невялікім навуковым музеі, становіцца крыўдна, што ў большасці сталічных школ няма пэўнага плана пазнавальных экскурсій і класныя кіраўнікі са школьнікамі ў вольны час сёння часцей выбіраюцца ў нейкія забаўляльныя цэнтры. Можа, у гэтым годзе, які прысвечаны навуцы, нешта нарэшце зменіцца?

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.** *dziadziula@zviazda.by*

# СЁННЯ І ЗАЎТРА ПЕНСІЙНАЙ СІСТЭМЫ

## Страхавы стаж для некаторых катэгорый грамадзян, магчыма, будзе перагледжаны

**З 1 студзеня 2017 года ў нашай краіне пачалося паэтапнае штогадовае павышэнне на 6 месяцаў пенсійнага ўзросту да дасягнення мужчынамі 63 гадоў, а жанчынамі — 58 гадоў. Паралельна павялічваецца ўзрост, які дае права на льготныя працоўныя пенсіі па ўзросце і за выслугу гадоў. Якіх яшчэ змен чакаць у пенсійнай сістэме? Ці магчыма такое, што будзе зменены парадак выплаты пенсіі працуючым пенсіянерам? На гэтыя і іншыя пытанні адказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Беларусі.**



Цяпер Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны прапрацоўваецца пытанне аб пераглядзе патрабаванняў страхавога стажу для некаторых катэгорый людзей з доўгімі «крэдытнымі» перыядамі. Пра гэта заявіў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ** падчас анлайн-канферэнцыі на тэму «Пенсійнае забеспячэнне: сёння і заўтра», якая праходзіла на сайтах Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і БЕЛТА.

Як вядома, да нядаўняга часу страхавы стаж для фарміравання права на пенсію складаў 5 гадоў. У 2014 годзе ён быў павялічаны да 10 гадоў, у 2015 годзе — да 15 гадоў. Затым тэмпы павышэння страхавога стажу запаволіліся: цяпер ён павялічваецца штогод на 6 месяцаў — да 2025 года, калі патрабаваны стаж працы з выплатай абавязковых страхавых узносаў дасягне 20 гадоў. У сувязі з тым, што цяпер з'явілася катэгорыя людзей, узрост якіх падышоў да пенсійнага, але разам з тым ім не хапае страхавога стажу для прызначэння пенсіі, паўстала пытанне, як ім дапамагчы. Калі змены да патрабаванняў страхавога стажу для пэўных катэгорый асоб будуць прынятыя, Мінпрацы і сацабароны праінфармуе пра гэта праз СМІ.

***

Многіх хвалюе пытанне, ці не будзе прадугледжана ў будучыні зніжэнне пенсійнага ўзросту асобным катэгорыям грамадзян пры доўгім стажы працы з выплатай страхавых узносаў. Атрымліваць пенсію раней за агульнаўстаноўлены пенсійны ўзрост, па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Наталлі МУРАШКЕВІЧ,** ніхто не будзе: «З улікам адносна нізкага пенсійнага ўзросту ў Беларусі (нават пасля яго павышэння да 58/63 гадоў) зніжэнне гэтага ўзросту для грамадзян з доўгім стажам працы не прадугледжана і не плануецца».

***

На 1 студзеня гэтага года 25,4% атрымальнікаў пенсій (гэта 665,8 тысячы чалавек) працягвалі працаваць. Пры гэтым жанчын сярод працуючых пенсіянераў удвая больш, чым прадстаўнікоў моцнай палавіны (451,5 тысячы жанчын і 214,2 тысячы мужчын). Нацыянальным заканадаўствам устаноўлена абмежаванне ў выплаце пенсій для тых, хто меў высокую заработную плату ў мінулым і чый індывідуальны каэфіцыент заробку перавышае 1,3. Рэальна пенсійныя выплаты абмяжоўваюцца нязначна: большасць працуючых пенсіянераў атрымліваюць пенсіі без вылікаў. Змяненне парадку выплаты пенсіі працуючым пенсіянерам, па словах Наталлі Мурашкевіч, не плануецца.

***

У сувязі з тым, што, як аказалася, многія не могуць разабрацца, ці залічваецца ў стаж для пенсіі ваенная служба, Наталля Мурашкевіч тлумачыць: «Перыяды ваеннай службы ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, а таксама службы ва Узброеных Сілах былога СССР (за выключэннем ваеннай службы на тэрыторыі Латвіі), як і іншыя перыяды грамадска карыснай дзейнасці без выплаты абавязковых страхавых узносаў, уключаюцца ў стаж працы, які ўлічваецца пры вылічэнні памеру прызначанай пенсіі. Аднак для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце і за выслугу гадоў неабходна мець патрабаваны мінімальны стаж працы з выплатай абавязковых страхавых узносаў — у гэты стаж перыяды ваеннай службы і іншыя перыяды дзейнасці без выплаты страхавых узносаў не ўключаюцца».

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

### У тэму

### ФПБ прапаноўвае падтрымаць сем'і, якія маюць чацвярых дзяцей

**Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі прапанавала Міністэрству працы і сацыяльнай абароны разгледзець пытанне аб унясенні змяненняў у закон аб пенсійным забеспячэнні для падтрымкі грамадзян, якія маюць чацвярых дзяцей.**

Цяпер у стаж працы залічваецца перыяд водпуску па доглядзе дзіцяці і перыяд догляду дзяцей да дасягнення імі ўзросту трох гадоў, але не больш за дзевяць гадоў у агульнай суме. Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі лічыць, што норма не адпавядае прынцыпам сацыяльнай справядлівасці. Атрымліваецца, што тым, у каго трое дзетак, гэтыя перыяды ўключаюцца ў поўным аб'ёме, адначасова для тых, хто мае пяцёра і больш дзяцей, прадугледжаны дадатковыя льготы. Бацькам жа, якія выхоўваюць чацвярых дзяцей, у стаж працы залічваецца толькі 75% такога водпуску. «Мы прапануем залічваць ім перыяд такіх водпускаў у поўным аб'ёме — 12 гадоў», — адзначае **намеснік старшыні ФПБ Алена МАНКЕВІЧ.**

## Будзь у курсе!

### У паяздах пройдзе эксперымент

**У мэтах аптымізацыі правядзення памежных і мытных працэдур у паяздах міжнародных ліній 12 красавіка адбудзецца эксперыментальны рэйс паяздоў №805 Мінск — Вільнюс і №806 Вільнюс — Мінск з правядзеннем дадзеных працэдур на станцыі Мінск-Пасажырскі.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, ад Мінска да Вільнюса і назад састаў пойдзе без прыпынкаў для высадкі і пасадкі пасажыраў на станцыях Маладзечна і Гудагай. Пасадка ў поезд №805 Мінск — Вільнюс у гэты дзень пачнецца ў 7.15 і скончыцца ў 7.45. У перыяд з 7.15 да 8.00 супрацоўнікамі памежных і мытных органаў будуць праводзіцца неабходныя кантрольныя мерапрыемствы. Пасля прыбыцця поезда №806 Вільнюс — Мінск на станцыю Мінск-Пасажырскі (у 21.40) таксама будзе ажыццёўлены памежна-мытны кантроль.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


БОБОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

**3 мая 2017 года в 15.30 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Инженерная инфраструктура | Расходы по подготовке (руб.) | Начальная цена земельного участка (руб.) | Задаток (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гомельский район, Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Садовая, участок №240 | 321080800601000899 | 0,1227 га | Имеется возможность электроснабжения, проводятся работы по централизованному водоснабжению | 1223,03 и расходы за опубликование в СМИ | 7955,67 | 795,57 |
| 2 | Гомельский район, Бобовичский с/с, д. Осовцы, ул. Новая, участок №28 | 321080800801000230 | 0,1497 га | Имеется возможность электроснабжения | 1387,07 и расходы за опубликование в СМИ | 11236,55 | 1123,66 |
| 3 | Гомельский район, Бобовичский с/с, д. Уза, ул. Городская, участок №7 | 321080801201000273 | 0,1200 га | Имеется возможность электроснабжения, централизованного водоснабжения | 1474,12 и расходы за опубликование в СМИ | 8782,08 | 878,21 |

Аукцион состоится по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51А, зал заседаний Гомельского райисполкома **03.05.2017 в 15.30.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и сроке, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

документ, подтверждающий внесение суммы задатков (на расчетный счет с отметкой банка);

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта); представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участником аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет №3641414020045 Бобовичского сельского исполнительного комитета, филиал №302 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Барыкина, 94, МФО 151501664, УНП 400178403.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Бобовичи, ул. Пролетарская, 1А, Бобовичский сельский исполнительный комитет с даты опубликования извещения до 28 апреля 2017 года.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в Бобовичском сельском исполнительном комитете.

**Контактные телефоны: +375291390201, (8-0232) 910234, 910244, 910247.**



БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

УНП 290671335

Открытого акционерного общества «Гранд Фэшен Хаус»

на 01 января 2017 года

*тыс. руб.*

| АКТИВЫ | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|
| 1. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | **5 112** | **5 209** |
| Основные средства | 5 090 | 5 187 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 4 | 4 |
| Вложения в долгосрочные активы | 0 | 0 |
| Прочие долгосрочные активы | 18 | 18 |
| 2. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | **408** | **359** |
| Запасы, в том числе | 35 | 36 |
| материалы | 35 | 36 |
| Расходы будущих периодов | 0 | 80 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 67 | 101 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 296 | 135 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 10 | 7 |
| **БАЛАНС** | **5 520** | **5 568** |
| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
| 3. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | **2 543** | **2 277** |
| Уставный капитал | 1 347 | 1 345 |
| Собственные доли (доли в уставном капитале) | 0 | 0 |
| Резервный капитал | 3 | 3 |
| Добавочный капитал | 540 | 542 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 653 | 387 |
| 4. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | **1 347** | **1 753** |
| Долгосрочные кредиты и займы | 1 133 | 1 397 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 142 | 284 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 72 | 72 |
| 5. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | **1 630** | **1 538** |
| Краткосрочные кредиты и займы | 224 | 364 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 425 | 375 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность, в том числе | 914 | 799 |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 330 | 100 |
| по авансам полученным | 65 | 111 |
| по налогам и сборам | 73 | 71 |
| По социальному страхованию и обеспечению | 3 | 6 |
| по оплате труда | 8 | 9 |
| по лизинговым платежам | 281 | 324 |
| Собственнику имущества (учредителям, участникам ) | 0 | 0 |
| прочим кредиторам | 154 | 178 |
| Доходы будущих периодов | 67 | 0 |
| **БАЛАНС** | **5 520** | **5 568** |

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

с 1 января 2016 по 31 декабря 2016 г.

*тыс. руб.*

| Наименование показателей | За 2016 год | За 2015 год |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 1 826 | 1 747 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | (872) | (888) |
| Валовая прибыль | 954 | 859 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 954 | 859 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 289 | 445 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | (292) | (471) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 951 | 833 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 0 | 0 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 0 | 0 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 0 | 0 |
| проценты к получению | 0 | 0 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | (1) | (4) |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 0 | (4) |
| прочие расходы от инвестиционной деятельности | (1) | 0 |
| Доходы по финансовой деятельности | 222 | 245 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 218 | 238 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 4 | 7 |
| Расходы по финансовой деятельности | (847) | (1 178) |
| В том числе: проценты к уплате | (285) | (272) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | (389) | (670) |
| прочие расходы от финансовой деятельности | (173) | (236) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | (626) | (937) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | **325** | **(104)** |
| Налог на прибыль | **(59)** | **0** |
| Чистая прибыль (убыток) | **266** | **(104)** |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемых в чистую прибыль (убыток) | 0 | 0 |
| **Совокупная прибыль (убыток)** | **266** | **(104)** |

ИНФОРМАЦИЯ О ЗАДОЛЖЕННОСТИ

*тыс. руб.*

| Наименование показателей | За 2016 год | За 2015 год |
|---|---|---|
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | 1 347 | 1 753 |

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

| Наименование показателей | Единицы измерения | За 2016 год | За 2015 год |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0 | 0 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 12,27 | 10,99 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

Среднесписочная численность работающих (человек) – 41.

Основной вид деятельности – **сдача внаем собственного недвижимого имущества.**

Количество акционеров: **всего – 43,**

**в том числе юридических лиц – 8, из них нерезидентов – 3.**

**физических лиц – 35, из них нерезидентов – 3**

Доля государства в уставном фонде эмитента **– 0%.**

**Правила корпоративного поведения применяются. Регламент работы ОАО «Гранд Фэшен Хаус» с реестром владельцев ценных бумаг утвержден очередным общим собранием акционеров 04.03.2010 г. Ведется учет аффилированных лиц Общества в соответствии с Положением об учете аффилированных лиц, утвержденных решением совета директоров 30.09.2011 г.**

Дата проведения годового собрания **– 17 марта 2017 года.**

# КАБ ПАЧУЦЬ СЛОВА «МАМА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Да нас у лабараторыю звярталіся жанчыны, у якіх было па 6—7 няўдалых цяжарнасцяў. Аднойчы з глыбінкі прыехала жанчына, у якой за дваццаць гадоў сямейнага жыцця было 17 (!) спроб нарадзіць дзіця, але ўсе яны скончыліся спантанным абортам. Тры гады таму мы ўкаранілі ДНК-дыягностыку схільнасці да невынашэння цяжарнасці. І за гэты час даследавалі больш як 5 тысяч жанчын з невядомымі прычынамі рэпрадуктыўных страт, — расказвае Ірма Массэ. — Нядаўна правялі апытанне сярод жанчын, якія праходзілі ў нашай лабараторыі даследаванне 1,5 года назад і яшчэ раней, каб даведацца, ці збылася іх мара — стаць маці? На тысячу адпраўленых запытаў атрымалі 707 адказаў. Высветлілася, што з гэтай колькасці зацяжарылі 553 жанчыны, з іх 435 ужо нарадзілі дзяцей і яшчэ 44 чакаюць хуткага з'яўлення на свет доўгачаканага дзіцяці.

## Спраўджаныя надзеі

На стале ў Ірмы Барысаўны стос лістоў ад жанчын, якія палічылі патрэбным падзяліцца з ёй сваёй радасцю.

*«Велізарная ўдзячнасць ад усёй нашай сям'і за нараджэнне сына. Нізкі Вам паклон за тую радасць і надзею, што вы дорыце людзям».*

*«Вялікі дзякуй за вашу дапамогу, мы сталі самымі ШЧАСЛІВЫМІ БАЦЬКАМІ цудоўнага сыночка!»*

*«Паважаная Ірма Барысаўна, спяшаюся паведаміць Вам, што дзякуючы вашаму даследаванню, у нашай сям'і нарадзілася дачушка Кацярына. Я захавала цяжарнасць і ў згаданы тэрмін нарадзіла... Усім знаёмым буду рэкамендаваць зрабіць у вас генетычны пашпарт».*

*«Мяне завуць Вераніка. У чэрвені 2015 года я праходзіла ў вас генетычнае даследаванне, па выніках якога ў мяне была выяўлена спадчынная трамбафілія. У жніўні 2015 года я зацяжарыла пасля двух выкідышаў. Зацяжарыла адразу двойняй! Падчас цяжарнасці калола фрагмін. Цяжарнасць працякала добра... Нарадзіла двух хлопчыкаў. Дзякуй Вам вялікае за тое, што вы ёсць, за вашу працу, за магчымасць, дзякуючы ўстаноўленым прычынам, стаць маці! (Шматдзетнай маці!!!)»*

*«Дзякуй Вам за вашу працу! У мяне нарадзіліся цудоўныя немаўляты, двайняты — хлопчык і дзяўчынка!!!:)»*

*«Вялікая ўдзячнасць прафесару Ірме Барысаўне Массэ за ўнікальныя даследаванні ў вельмі тонкай сферы, якой яна прысвяціла ўсё сваё жыццё! Вашы даследаванні вельмі важныя для ўсіх нас. Нізкі паклон за ўсё! Хацелася б пажадаць поспехаў і росквіту ўсяму вашаму калектыву».*

## Спадчыннасць — не прысуд

Цікавімся ў загадчыцы лабараторыі генетыкі чалавека, што ж такое спадчынная трамбафілія? Высвятляецца, што для яе ўласцівая павышаная схільнасць да ўтварэння тромбаў. Генетычная рызыка трамбафіліі рэалізуецца толькі пры дадатковых умовах, адной з такіх умоў і з'яўляецца цяжарнасць. Увогуле цяжарнасць і нараджэнне дзіцяці — вельмі складаныя фізіялагічныя працэсы. Даказана, што носьбіцтва пэўных генаў можа змяняць працяканне біяхімічных працэсаў у арганізме маці і быць прычынай невынашэння цяжарнасці.

У жанчын са спадчыннай трамбафіліяй пры развіцці цяжарнасці ў плацэнце ўтвараюцца мікратромбы. Ад недахопу кіслароду і пажыўных рэчываў церпіць плод, у выніку чаго адбываецца выкідыш або цяжарнасць не развіваецца. Часцей за ўсё выкідыш адбываецца ўжо ў першым трыместры.

— Генетычнае тэсціраванне дазваляе выявіць прычыны парушэння працякання цяжарнасці ў кожным канкрэтным выпадку. Калі ДНК-аналіз указвае на высокую рызыку ўтварэння тромбаў, гэта яшчэ не прысуд. З дапамогай тэрапеўтычнай карэкцыі, якую здольныя правесці ўрачы, цяжарнасць можна захаваць і нарадзіць здаровае дзіця, — тлумачыць Ірма Массэ. — У жанчын ужо нават з'явіўся выраз «нараджаць на фрагміне». Дозу гэтага прэпарату вызначаюць урачы. Мы толькі канстатуем праблему. Для жанчыны вельмі важна патрапіць да добрага спецыяліста. Падчас цяжарнасці патрабуецца пастаянны кантроль гематолага...

**Лабараторыя генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі адзіная ў СНД мае міжнародную акрэдытацыю ў гэтай галіне.**

«Нашы даныя сведчаць, што 86,6% жанчын, якія не маглі выносіць дзіця, паспяхова нарадзілі ці народзяць у найбліжэйшы час. Гэта вельмі добры вынік, — лічыць кіраўнік лабараторыі генетыкі чалавека. — Нават калі б на свет нарадзіліся 10 дзяцей, дзеля гэтага трэба было б працаваць. Толькі ўявіце сабе, што адчувае жанчына, якая адчаялася і ўжо амаль згубіла надзею на мацярынства. У свеце сёння абмяркоўваюць, калі трэба прызначаць тэсціраванне генетычных прычын невынашэння цяжарнасці? Гэта дыскусійнае пытанне. Ёсць меркаванне, што пасля трох страчаных цяжарнасцяў. У Расіі лічаць, што пасля дзвюх. А, на маю думку, лепш было б прайсці даследаванне яшчэ на этапе планавання мацярынства, каб захаваць ужо першую цяжарнасць і не перажыць моцны стрэс».



Фота Надзеі БУЖАН.



**Малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі генетыкі чалавека Кацярына НЕСЦЯРЭНКА і навуковы супрацоўнік Аляксандр ГАНЧАР за работай.**

## Найлепшы падарунак

Ірма Массэ расказала, што падрыхтаваны праект-заданне па выяўленні высокай рызыкі страты цяжарнасці, на якое выдзяляюцца бюджэтныя сродкі. У яго рамках генетыкі будуць бясплатна правяраць маладых жанчын:

— Магчыма, прапануем прайсці даследаванне старшакурсніцам у ВНУ ці будзем дзейнічаць праз загсы. Не ва ўсіх жа ёсць грошы, каб заплаціць за наша даследаванне. Калі жанчына страціла ўжо некалькі цяжарнасцяў, то яна аддасць любыя грошы, а да першай цяжарнасці мала хто задумваецца пра пагрозу. Да таго ж для нас акрамя практычнага прымянення ДНК-тэсціравання вельмі важныя навуковыя даследаванні, якія дапамогуць даведацца пра частату знаходжання генаў, вінаватых у невынашванні цяжарнасці, у нашай папуляцыі. Будзем правяраць і тых жанчын, якія ўжо паспяхова нарадзілі двух дзяцей, каб параўнаць іх генатып з генатыпам жанчын, у якіх ёсць праблемы з тым, каб стаць маці.

Па словах спецыяліста, у лабараторыі генетыкі чалавека сёння правяраюць 14 генаў, ад якіх можа залежаць нармальнае працяканне цяжарнасці: «Увогуле ж за працэсы згусання крыві адказвае вялікая колькасць генаў — не менш як 30. Таму правяраць толькі 3—4 гены, як гэта робяць нашы замежныя калегі, мы лічым не зусім правільным. Атрыманыя ад дзяржавы на навуковыя даследаванні сродкі плануем выдаткаваць таксама на карэкціроўку панэлі генаў, якія вывучаюцца. Магчыма, дадавім больш інфарматыўныя гены, якія ўносяць самы істотны ўклад у праблему, а штосьці, наадварот, выключым. Будзем працаваць разам з РНПЦ «Маці і дзіця» і Інстытутам трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Міністэрства аховы здароўя.

Між іншым, лабараторыя генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі адзіная ў СНД мае міжнародную акрэдытацыю ў гэтай галіне. Каб патрапіць сюды, накіраванне не патрабуецца, паколькі ДНК-тэсціраванне — працэдура платная. Многія ўрачы ўжо ведаюць, што ёсць такая магчымасць — праверыць генетычную схільнасць да невынашвання цяжарнасці, і падказваюць жанчынам, дзе гэта можна зрабіць. Але ёсць і такія, што ставяцца негатыўна,

**Нават калі б на свет нарадзіліся 10 дзяцей, дзеля гэтага трэба было б працаваць.**

упэўнены, што гэта проста марнаванне грошай.

— Генетычны пашпарт робіцца адзін раз у жыцці, паколькі генетычныя паказчыкі пасля нараджэння чалавека ўжо не змяняюцца. Мы ўсе з вамі — носьбіты ўнікальнай генетычнай інфармацыі. Між іншым, гены, якія адказваюць за трамбафілію, вінаватыя таксама ў інфарктах і інсультах, хоць гэта можа праявіцца значна пазней, у больш сталым узросце, — папярэджвае Ірма Массэ. — Цяжарнасць проста становіцца «індыкатарам» наяўнасці праблемы. Таму, калі мы знаходзім такія небяспечныя мутацыі ў жанчын, таксама раім ім праверыць дзяцей і сваякоў. Ведаючы ступень рызыкі, можна на корані спыніць атрыманую ў спадчыну хваробу...

Напрыклад, мы ў сваёй лабараторыі падчас ДНК-дыягностыкі схільнасці да сардэчна-сасудзістых захворванняў вывучаем 20 генаў, якія ўплываюць на тромбаўтварэнне. Таксама вызначаем генетычныя фактары рызыкі развіцця і іншых паталогій: дыябету, астэапарозу, метабалічнага сіндрому... Ёсць захворванні, якія на 100 працэнтаў залежаць ад спадчыннасці. З імі дзіця альбо нараджаецца, альбо яны немінуча праяўляюцца ўжо ў сталым узросце. Напрыклад, хваробы Паркінсона і Альцгеймера. Усе іншыя захворванні (нават частыя прастуды і схільнасць да траўматызму) таксама маюць генетычную прыроду, але залежаць і ад ладу жыцця чалавека. Веды пра генетычную схільнасць да развіцця захворванняў дазваляюць ажыццяўляць прафілактыку або раннюю дыягностыку паталогій, карэктна вызначыць прагноз развіцця небяспечных ускладненняў і правільна выбіраць метады лячэння.

Ірма Массэ ўпэўнена, што генетычнае тэсціраванне стане неад'емным складнікам медыцыны будучыні, так званай «медыцыны 4П»: персаналізаванай, прэдыктыўнай (маецца на ўвазе магчымасць прадказваць захворванне да з'яўлення першых сімптомаў), папераджальнай (прафілактычнай) і партысіпатыўнай, якая прадугледжвае актыўны ўдзел пацыента ў прафілактыцы захворванняў і іх лячэнні. Дарэчы, адна з жанчын, якая дзякуючы ДНК-дыягностыцы стала маці, прывяла ў лабараторыю сваё дзіця і зрабіла яму генетычны пашпарт. Сказала, што гэта будзе найлепшы падарунак на дзень нараджэння...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*nikalaeva@zviazda.by*

---

■ Ёсць ідэя!

# QR-РАГАЧОЎ

**Зблізіць свет рэальны з віртуальным на прыкладзе Рагачова прапануюць мясцовыя школьнікі**

**На праект «100 ідэй для Беларусі» яны выходзяць з ініцыятывай устанавіць QR-коды на будынках, вартых асаблівай увагі турыстаў і ўвогуле грамадзян, неабыякавых да сваёй гісторыі.**



Невялікі горад, які сёлета рыхтуецца адзначыць сваё 875-годдзе, даволі часта наведваюць турысты — у тым ліку насельнікі найбліжэйшага санаторыя. Лячэбная ўстанова добра зарэкамендавала сябе, таму шлях у прыгожыя мясціны, дзе Друць зліваецца з Дняпром, знаходзяць не толькі беларусы, але і шматлікія замежнікі. Магчыма, хутка ім не прыйдзецца, шпацыруючы па вуліцах райцэнтра, шукаць некага, хто раскажа пра мясцовыя адметнасці і славутасці. Галоўнае, каб быў у наяўнасці тэлефон з відэакамерай і ўстаноўленай праграмай.

**Аліна ПАШКІНА** заканчвае школу №2 у Рагачове і лічыць, што вэб-квэст «Турыстычная Беларусь» абавязкова спадабаецца лёгкасцю выкарыстання і цікавай інфармацыяй, пра якую дзяўчына паклапацілася разам з сябрамі:

— Ствараецца QR-код, у ім кадзіруецца інфармацыя пра пэўны будынак, вуліцу ці іншы прадмет, які мае гістарычную значнасць. Вось вы прыязджаеце ў наш горад, і вас зацікавіла гісторыя будынка былой земскай управы. З дапамогай тэлефона скануеце QR-код і ў тую ж секунду атрымліваеце ўсю патрэбную інфармацыю.

Дарэчы, цагляны будынак колішняй земскай управы сёння займае Дом кнігі. Яго ўрачыста адкрылі на леташні Дзень беларускай пісьменнасці. Гісторыя пабудовы пачынаецца з 1909 года.

— Не на ўсіх будынках можна замацоўваць шыльды, — працягвае Аліна. — У такім выпадку, каб не пашкодзіць фасад, мы прапануем размяшчаць QR-код перад будынкам. Гэта можа быць таблічка, абароненая ад вандалаў і неспрыяльных умоў надвор'я.

Цікава, што школа, у сценах якой узнікла ідэя, таксама адносіцца да ліку рагачоўскіх славутасцяў. У масіўным цагляным будынку, якому больш за стагоддзе, калісьці змяшчалася рэальнае вучылішча. Гэта адзін з нямногіх помнікаў архітэктуры, які захаваўся ў горадзе з дарэвалюцыйных часоў, пры гэтым не страціў сваіх асноўных канструкцыйных асаблівасцяў. Афіцыйна годам адкрыцця рэальнага вучылішча, пабудаванага з элементамі неакласічнага стылю, лічыцца 1906 год. Частку другога паверху займала дамавая царква ў імя святой вялікапакутніцы Варвары. Дарэчы, сродкі на ўстанову ахвяравала ўдава стацкага саветніка Варвара Іолшына.

Вядома, свае ідэі школьнікі генерыруюць з дапамогай і пры падтрымцы дарослых. У выпадку прапановы з усталёўкай QR-кодаў дзецьмі кіруе **настаўнік гісторыі Вольга КРАЎЧАНКА:**

— Дзеці мяне саму натхняюць. Яны гавораць, што хочуць дзяліцца ведамі, і мы разам шукалі, як такую ідэю папулярызаваць. Зразумела ж, я падтрымала школьнікаў. У нас ёсць свой сайт. Мы пастаянна праводзім даследчыцкую работу, і мая задача — дапамагчы, каб даныя, якія дзеці прадстаўляюць у праекце, былі гістарычна вернымі. Мы прыцягваем у гэты праект многа людзей, каб урэшце ўсё было і цікава, і гістарычна правільна.

Між тым Рагачоў вядомы не толькі згушчонкай, якой тут усталяваны помнік ад усіх удзячных ласуноў. Увагу прыцягвае дом купца Беленькага, пабудаваны ў канцы XIX — пачатку XX ст. з цэглы і рэканструяваны ў 1950 годзе.

Прыватны дом у Рагачове, у якім надоўга спыняўся і жыў Уладзімір Караткевіч, быў пабудаваны больш за стагоддзе таму — у 1914 годзе — дзедам пісьменніка Васілём Грынкевічам. У гэтым доме Караткевіч меў асобны пакой, дзе былі створаны «Ладдзя Роспачы», «Сівая легенда», «Віно дажджоў», часткова «Каласы пад сярпом тваім» і часткова «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

*iost@zviazda.by*

■ Нотны радок

# МУ́ЗЫКА АД МУЗЫ́КАЎ



**Ёсць музыка, якую ствараюць музыканты. Прафесійна і якасна. А ёсць музыка, за якой — музыкі. Яны не толькі прафесіяналы, якія жывуць сваёй працай, яны працягваюць справу Музыкі для Беларусі. Той, якая ад каранёў і дзякуючы традыцыям. Той, якою мала жыць і якую мала іграць ці спяваць. У яе трэба ўвайсці аднойчы, паглыбіцца цалкам, каб з глыбіні выцягнуць перліны і паказаць, як яны зіхацяць, калі належным чынам афармленыя людзьмі. Такой справай 25 гадоў займаюцца музыкі гурта «Палац» (якія засталіся ў ім сёння, і якія прайшлі праз яго ў мінулыя гады). За сваю справу, зробленую за гэтыя гады, яны будуць трымаць справаздачу 4 красавіка падчас канцэрта для сяброў і новых слухачоў, якія цікавяцца асаблівай беларускай песняй, — як яна гучыць у выкананні саліста і музыкі Алега Хаменкі. І гэта яго свята — 50-годдзе, з якога палова жыцця прайшла з «Палацам». Беларуская музыка (і наогул культура) такая: трымаецца за тых, хто аднойчы яе зразумеў і палюбіў.**

***— Так сышліся зоркі, што разам з адкрыццём гурта «Палац» людзі, грамадства рабілі для сябе адкрыццё беларускай культуры: гэта быў канец 80-х — пачатак 90-х...***

— А можа, для грамадства гэта пачалося ў сярэдзіне 20-х ці яшчэ раней — у часы Дуніна-Марцінкевіча...

***— Але чарговая хваля здарылася для нашага пакалення. Каб узляцець на ёй, вы павінны былі зрабіць адкрыццё для сябе. Што аб'яднала вас у гурт, але не толькі як музычны калектыў, а як калектыў аднадумцаў? Няўжо толькі тое, што вучыліся ў адной ВНУ?***

— І гэта паўплывала... Я шмат разоў імкнуўся сам для сябе знайсці адказ на гэтае пытанне, і дакладнага яго ў мяне няма дагэтуль. Сышліся адразу столькі складнікаў, але ніводзін не можа быць вылучаны як вырашальны. Сукупнасць усяго, якая прывяла да жадання засяродзіцца ў нейкі момант на тым, што гэта ж важна! Мала таго, гэта можа быць і цікава, і паспяхова.

Бацькі ўсіх з гурта — вельмі простыя людзі. Калі ўдавалася здабыць якасную гітару — гэта была перамога над абставінамі жыцця. Мы дамовіліся з дзяўчынай, якая працавала ў краме «Музыка», каб яна нам паведаміла, калі з'явяцца чэшскія гітары ў продажы. Як яна патэлефанавала, то грошай, каб набыць, не хапала, у бацькоў пазычалі. У нейкі момант мы купілі сабе гітары, на якіх больш-менш можна было іграць... Можа вось гэты момант, жаданне перамагчы абставіны, зрабілі сваю справу: добрыя, якасныя музычныя інструменты падштурхнулі не кідаць гэта. Ды яшчэ бацькі далі апошнія грошы...

***— Яны, відаць, верылі, што сын займаецца вартай справай.***

— Я не прасіў ніколі нічога. Калі вучыўся ў школе, не меў ні джынсаў, ні дыпламата, у 80-я ўсе ў школу хадзілі з дыпламатамі. Мяне бацькі вельмі любілі, яны казалі: мы табе харошы партфельчык купім. Праўда, купілі, дарагі харошы скураны партфельчык у школу хадзіць, міністэрскі. Але ўсе ходзяць з дыпламатамі, а я з гэтым партфельчыкам... Я яго як папку насіў, у яго пры неабходнасці яшчэ ўкладаліся кеды.

***— Магчыма, гэта быў пачатак загартоўкі: вылучацца з натоўпу і ўсталёўваць сваю моду, свой кірунак, нават калі ўсе робяць інакш. Хто можа падтрымаць у такіх умовах? Найперш блізкія людзі. Ці знаходзіць водгук тое, што вы робіце, у вашых бацькоў?***

— Памятаю, як аднойчы мама сказала: «Ох, Алег, як хараша ты пяеш... А працуеш ты дзе?» Гэта была выдатная ацэнка маёй творчасці... Яна прыняла, сказала, што ёй падабаецца. Але тое, што гэта можа быць працай, ёй не ўяўляецца і сёння.

***— Сёння ў Беларусі з музыкі жыць магчыма?***

— Магчыма. Немагчыма жыць толькі з канцэртна-гастрольнай дзейнасці. І з аўтарскіх таксама сёння не пражывеш. Гэта можа быць нейкае падсілкаванне, але для таго, каб жыць з канцэртна-гастрольнай дзейнасці, павінна быць арганізаваная сітэма шоу-бізнесу, а яго пакуль няма. Наогул для той прадукцыі, якую мы прадстаўляем, у нас не надта шырокая прастора на рынку. Па-першае, сама песня асаблівая, а яшчэ і на беларускай мове, рынак звужаны да некалькіх дзясяткаў тысяч чалавек.

***— Некаторыя разважаюць: гэта такая мясцовая экзотыка...***

— Гэта жудасна, калі беларускі фольк так успрымаецца, што для мяне крыўдна: гэта не мы, а яны — экзотыка. А мы — праўда, за якой гісторыя.

***— Сярод замежных арганізатараў фестываляў ці студый можа быць цікавасць да такой асаблівай беларускай музыкі?***

— На жаль, мы не можам даць той прадукт, які мог бы быць прыцягальны для сур'ёзнай сістэмнай працы. Гэты прадукт павінен быць запатрабаваны, таму сінхранізаваны згодна з іх падыходамі, ён павінен адпавядаць стандартам, якія неабходныя для музычнага прадукту, каб яго ўключылі ў маркетынг. Прадукт — і «Палаца», і большасці беларускіх музыкаў — не адпавядае стандартам, каб яго рэалізоўваць на заходнім рынку. Таму супрацоўніцтва хутчэй за ўсё можа быць абмежаванае фестывалямі. Калі цяпер беларускія музыканты выходзяць на замежныя шоу-кейсы, то рэакцыя такая: што датычыцца самой музыкі — выдатна! А потым уступаюць у гульню роўт-менеджары... І вердыкт: прадукт неканкурэнтаздольны. Ім патрэбны прадукт, які яны змогуць прадаць на заходнім рынку для той аўдыторыі. Што ім нашы высокія мэты як адраджэнне мовы? Вось валійскую за чатыры гады адрадзілі, а ў значна большай Беларусі, якая да таго ж мае незалежнасць, чамусьці гэта так важна. Ім цяжка гэта зразумець.

***— Можа быць гэта на карысць беларускай культуры, што мы не ўключаны ў заходні рынак, — мусім рабіць адмысловы прадукт для сябе?***

— Тады наш адмысловы прадукт, калі ён будзе развівацца ў закрытай прасторы, не будзе высокага ўзроўню, не стане канкурэнтаздольны з тым прадуктам, які прыйдзе звонку. У адасобленым стане мы здольныя прапанаваць артэфакты, якія здараюцца, нарастаюць гурты, якія прадстаўляю я ў тым ліку на фолк-фэсце «Камяніца». Ёсць артэфакты, якія могуць быць высока ацэнены, але сістэмны прадукт так і не створыцца. Бо цяпер беларускай рок-музыцы, фольк-музыцы трэба спаборнічаць за слухача з амерыканскай шоу-індустрыяй, з расійскай шоу-індустрыяй, еўрапейскай. Супрацьстаяць нам складана, можам браць толькі арыгінальнасцю. І яшчэ тым, што калі трэба, то здолеем сыграць канцэрт, нават калі пад рукамі ёсць нейкія падручныя матэрыялы. А яны тым часам забіраюць каласальныя грошы для развіцця сваёй індустрыі, а для нас застаецца выпаленае поле.

***— І самаахвярная праца на энтузіязме дзеля высокіх ідэалаў?***

— Высокімі ідэаламі і самаахвярнасцю мы самі сябе падштурхоўваем. Паняцці высакароднасці справы таксама адыгрываюць сваю ролю ў творчым працэсе. Таму што яшчэ далёка не кожны ў грамадстве асэнсаваў нашу незалежнасць. Я часта сутыкаюся з неразуменнем таго, што такое нацыянальная культура, што гэта за зямля, чым мы адметныя. Што за песні такія асаблівыя ў беларускім фальклоры? Чаму гэта грунт для нацыянальнай культуры? Часам за фальклор выдаюць штосьці псеўданароднае. Ці наогул не тое, ды зусім не адсюль: вось, маўляў, мы Кадышаву спяваем...

***— Але складваецца ўражанне, што ў Беларусі стала больш цікавасці да сваёй музыкі.***

— Гэта цікавасць умоўная, несістэмная. Гэта ілюзія, што ў нас ёсць прага да чагосьці нацыянальнага, альтэрнатыўнага, несістэмнага (у сэнсе па паходжанні не з той савецкай сістэмы). Таму я б не сказаў, што цікавяцца. Не адмаўляюць.

***— Таму працягваем асветніцтва?..***

— На шмат гадоў. І гэта праца такая няўдзячная. Бо кожны ўпэўнены, што ведае правільна. А задумацца і перагледзець свае веды — складана. Жаданне ўспрымаць інфармацыю, якая не ўкладаецца ў даўнішняе меркаванне, рэальна вельмі балючы працэс, таму за сваё меркаванне некаторыя людзі трымаюцца ўпарта. Новая інфармацыя можа не ўпісвацца ў іх канцэпт. І што тады — яго ламаць? Гэта значыць, што ўсё жыццё пражыў дарэмна. А гэта прызнаваць не захоча ніхто. Ёсць такія веды, якія трэба даводзіць і ўкараняць праз жыццё некалькіх пакаленняў. Асабліва, калі вынішчаліся яны стагоддзямі. Але і дагэтуль не вынішчана ўсё... Аднаўленне — больш складаны шлях, чым разбурэнне.



Размаўляла
**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

■ Вернісаж

# ГУМАР ПЛЮС АЛЕГ ГУЦОЛ

## У Доме прэсы адкрылася выстаўка карыкатур



Фота Кастуся ДРОБАВА.

**Мастак Алег Гуцол актыўна супрацоўнічае з часопісам «Вожык», які падтрымаў з'яўленне экспазіцыі яго карыкатур на другім паверсе Дома прэсы. Арганізатарамі выстаўкі выступілі таксама Міністэрства інфармацыі Беларусі і Выдавецкі дом «Звязда».**

Мастак праілюстраваў больш за 60 кніг, прыняў удзел у больш чым 600 міжнародных выстаўках і конкурсах карыкатуры, а яго работы, што з'яўляюцца на старонках часопіса «Вожык», імпануюць чытачу. Бо гэта заўсёды шчыра, з гумарам і пра жыццё.

— Адзін блазан пераўзыдзе ўсіх каралёў і ўсіх прыдворных. Гэта тое, пра што ўсе ведаюць, але маўчаць. — адзначыў мастак Сяргей Волкаў на ўрачыстым адкрыцці выстаўкі. — Алег Гуцол — унікальная з'ява, чалавек-сонца. Усе яго работы выклікаюць усмешку і здаровы смех. І ўзровень яго прафесіяналізму надзвычай высокі — ён мае свой твар і ўласны мастацкі стыль, яго ні з кім не пераблытаеш. Думаю, такія работы трэба часцей змяшчаць на вокладках «Вожыка», а не толькі на ўнутраных старонках.

Варта адзначыць, што карыкатурай мастак прафесійна займаецца з 1987 года. У свой час ён друкаваўся ў часопісах «Перець», «Крокодил», «Чаян», «Тарiг» «Fenamizah» і іншых. Супрацоўніцтва з «Вожыкам» таксама аказалася надзвычай плённым. Літаратурны рэдактар часопіса Вераніка Мандзік акцэнтавала:

— Хацелася б звярнуць увагу на назву выстаўкі — «Антрапалогія». Я задумалася, чаму менавіта яна?.. Але калі прыйшла ў Дом прэсы і зірнула на малюнкі, усё стала відавочна. Антрапалогія — навука пра чалавека. Чалавек — істота разумная. А найпершая прыкмета інтэлекту і розуму — тонкае пачуццё гумару. Гэта тое, чым валодае спадар Гуцол, які дае нам магчымасць зірнуць на жыццё праз яго выдатны мастакоўскі густ і талент.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

■ На сцэне

# КАХАННЕ І ТУГА Ў БЕЛЬВЕДЭРЫ

**У новым спектаклі лялечнага тэатра ёсць усё, што трэба гледачу**

**официальный сайт организатора торгов**
**www.grodno.gov.by**

# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
## по продаже права аренды земельного участка для строительства торгового объекта в микрорайоне «Южный-5»(«Ольшанка-5») в городе Гродно 3 мая 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | Микрорайон «Южный-5» («Ольшанка-5») позиция по генплану №78 | 0,7986 | 440100000001008810 | 166 112,88 | 16 000,0 | 3 383,6 | Строительство торгового объекта со встроенными помещениями социально-гарантированного обслуживания, объекта общественного питания и бытового обслуживания |

* – земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 №49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 3 мая 2017 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет №57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 3 апреля по 27 апреля 2017 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

# УРИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

**3 мая 2017 года в 15.00 проводит открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена земельного участка (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гомельский район, Урицкий сельсовет , аг. Урицкое, ул. Рабочая, 63 (участок №39 по генплану) | 321089602101000703 | 0,1500 га | Электроснабжение,водопровод, гравийно-щебеночная дорога, участок свободен от застройки | 13 079,26 | 1307,93 | 1250,37 + расходы на размещение информации в СМИ |
| 2 | Гомельский район, Урицкий сельсовет , аг. Урицкое, ул. Рабочая, 54 (участок №53 по генплану) | 321089602101000704 | 0,1500 га | Электроснабжение,водопровод, гравийно-щебеночная дорога, участок свободен от застройки | 13 079,26 | 1307,93 | 1202,98 + расходы на размещение информации в СМИ |

**Аукцион состоится по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51А, малый зал (3-й этаж) Гомельского райисполкома 3.05.2017 в 15.00.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и срок, определенные в извещении.

**Документы, необходимые для участия в аукционе:**

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (на расчетный счет с отметкой банка).
3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
3.1. Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участником аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протоколов о результатах аукциона.

*Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет №3641414230037 Урицкого сельского исполнительного комитета, ЦБУ №305 филиала №302 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Барыкина, 94, МФО 151501664, УНП 400178472, код платежа 04901.*

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Урицкое, ул. Ятченко Н.Г, 3, Урицкий сельский исполнительный комитет, с даты опубликования извещения **по 28.04.2017 года** с 9.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00.

Все желающие могут ознакомиться с документацией в Урицком сельском исполнительном комитете.

Контактные телефоны: (80232) 988-291, 988-293, +375291397339 (МТС)



Андрэй ДЗІЧЭНКА.



Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ.



Антон ПІЛІПЧЫК.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ПІШЫЦЕ Ў «ЗВЯЗДУ»

**Рэдакцыі газет маюць выбар з мноства шляхоў, як наладзіць кантакт з чытачамі. Праз допісы і тэлефанаванні ў рэдакцыю, каментарыі на сайце ў інтэрнэце, водгукі ў сацыяльных сетках. У «Звязды» ж ёсць даўняя традыцыя — натхняць нашых чытачоў на творчасць. Менавіта таму мы цягам многіх гадоў ладзім конкурс апавяданняў, прыняць удзел у якім можа кожны.**

Нам дасылаюць успаміны пра маладосць, фантастычныя творы, казкі... Разам з куратарам конкурсу, вядомым пісьменнікам Алесем Бадаком мы ўважліва чытаем кожны з тэкстаў. Лепшыя з іх выходзяць на старонках нашай газеты, а аўтары трох найлепшых атрымліваюць магчымасць пабываць у рэдакцыі «Звязды», пазнаёміцца з калегамі і атрымаць узнагароды. Сімвалічна, што менавіта ўвесну мы сёлета адзначылі аўтараў трох найлепшых апавяданняў, што друкаваліся ў нашай газеце цягам мінулага года.

Так, у Мінск з Бярозаўкі, што на Лідчыне, завітаў Антон Піліпчык, аўтар апавядання «Праганяў чалавек лася...». Наш калега — а ён многа гадоў прысвяціў працы на ніве журналістыкі — расказаў, што летась ужо трэці раз даслаў празаічны твор на конкурс, і гэтая спроба стала выніковай. За сваё апавяданне спадар Антон атрымаў дыплом ІІІ ступені. ІІ месца заняла маладая аўтарка з Мінска Маргарыта Латышкевіч. Яе апавяданне «У.» нас уразіла шчырасцю, непасрэднасцю. А перамогу атрымаў Андрэй Дзічэнка, які апавяданнем «Кантакт» здзівіў куратараў конкурсу майстэрствам будаваць сюжэт і перакрыжоўваць розныя рэчаіснасці.

Нагадаем, што конкурс апавяданняў працягваецца і сёлета. Мы чакаем вашых твораў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Святлана Локтыш нарадзілася ў знакамітай вёсцы Люсіна Ганцавіцкага раёна. Знакамітай, у першую чаргу, дзякуючы таму, што менавіта яе жыццё-быццё, такім, якім яно было ў пачатку XX стагоддзя, апісаў Якуб Колас у сваёй цудоўнай аповесці «У палескай глушы». Якім бачыцца жыццё люсінцам крыху больш чым праз сто гадоў пасля таго, як у іх настаўнічаў малады Колас, можна адчуць і зразумець, калі пачытаць вершы Святланы Локтыш — дарэчы, аўтара паэтычнага зборніка «Вышыванка» і шматлікіх публікацый у перыёдыцы.**

**Апошнім часам Святлана часта звяртаецца і да жанру прозы: напісала шмат апавяданняў, працуе над аповесцю.**

**Апавяданне «Цыркачы», дасланае на конкурс «Звязды», найперш звяртае на сябе ўвагу сацыяльнай і маральнай завостранасцю, пераконваючы чытача ў тым, што і «тысяча першы» рэцэпт, як пазбавіцца ад нялюбага мужа, звычайна прыводзіць да сумнага фіналу, калі дзеля дасягнення мэты даводзіцца ісці на злачынства.**

**Алесь БАДАК.**

**Святлана ЛОКТЫШ**

# ЦЫРКАЧЫ

СЛОВЫ пракурора і вобраз падсуднага ніяк не звязваліся разам.

— У перыяд часу з дваццаць шостага чэрвеня па шаснаццатае верасня гэтага года падсудны Аляксей Лінькоў пяць разоў прымяніў сілу ў дачыненні да жонкі падчас сямейных скандалаў...

Суддзя напаўвуха слухаў, час ад часу пазіраў на Лінькова і чарговы раз гартаў яго справу, спрабуючы схапіць нешта няўлоўнае, што не давала спакою.

Наўмыснае прычыненне цялесных пашкоджанняў, штраф і мноства сутак, праведзеных на міліцэйскіх нарах. Пагаршала сітуацыю крымінальная адказнасць, да якой Лінькова прыцягнулі ў красавіку гэтага ж года. Тады суд вёў калега, які прысудзіў паўтара года абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову.

Атрымліваецца, не паспеў Аляксей Сяргеевіч адбыць пакаранне, як кулакі зноў засвярбелі. І ва ўсіх выпадках фігуруе спіртное.

ЗА АМАЛЬ тры месяцы, што Лінькоў правёў пад вартай, яго твар асунуўся, плечы згорбіліся. Але засталіся такімі ж інтэлігентнымі, хоць і больш напружанымі, жэсты, мяккімі — рухі. Міндалепадобныя зялёныя вочы глядзелі ясна, высокі лоб з невялікімі залысінамі вянчаў твар у форме трапецыі. Да таго ж гэты твар кагосьці нагадваў, з кім не звязваўся негатыў. Каго? Чый вобраз мітусіўся на задворках памяці?

Суддзя правёў далонню па лбе і шчоках, нібы скідаючы рэшткі роздумаў, успомніў вядомае «ў ціхім балоце чэрці водзяцца», звыкла загладзіў назад пасму валасоў. Затым падпёр рукой шырокі моцны падбародак і ўтаропіўся на пракурора.

— Высновы для сябе падсудны не зрабіў і не раскаяўся, — вяшчаў ментарскім голасам афіцыйны прадстаўнік абвінавачвання.

Суддзя паморшчыўся: вось хто можа ўлезці чалавеку ў душу і зразумець — «зрабіў ці не зрабіў высновы», «раскаяўся — не раскаяўся». Дзяжурныя фразы, якія апанавалі шматтомныя справы, часта перашкаджалі ўнікаць у сутнасць здзейсненага правапарушальнікамі і злачынцамі. Даводзілася прадзірацца, як скрозь нетры, да таго галоўнага, істотнага, важкага, што дапамагае прыняць адзіна правільнае рашэнне.

— ...За сістэматычнае збіванне жонкі, дваццацівасьмігадовай Ліньковай Алены Мікалаеўны, згодна з часткай другой артыкула сто пяцьдзясят чацвёртага Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Катаванне», прашу прызначыць падсуднаму Лінькову пакаранне ў выглядзе двух гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму, — скончыў афіцыйную прамову пракурор і ўжо звычайным тонам дадаў: — У мяне ўсё, Цімафей Іванавіч.

Суддзя адзначыў, як пракурор пераможна зірнуў на падсуднага, абцягнуў кіцель, тужэй зацягнуў рэмень са спражкай. Яго погляд перакінуўся на суддзю, і маленькія вочкі хутка-хутка заміргалі. «Гэтаму здароваму парсюку не перашкаджала б зняць з дзясятак лішніх кілаграмаў. Бач, адкарміла маладая жонка», — падумаў суддзя.

Пакуль ён моўчкі, задуменна ўзіраўся ў пракурора, той вырашыў, што ад яго чакаюць яшчэ нейкіх слоў. І дадаў ужо гутаркова-проста, трохі лісліва:

— У часы нашых продкаў, магчыма, і правільным было збіваць жонку. Але не сёння. Лінькоў не меў ніякага законнага права наносіць цялесныя пашкоджанні іншаму чалавеку.

Пракурор сеў.

Суддзя звярнуўся да Лінькова:

— Падсудны, устаньце!

Той вонкава спакойна падпарадкаваўся загаду, хваляванне выдала толькі далонь, якая падрыгвала, калі прыгладжваў валасы ад ілба да макаўкі галавы. Гэты жэст зноў падаўся суддзі знаёмым, зразумелым. «Дэжавю нейкае», — уздыхнуў ён і пачаў працэдуру апытання.

ПАКАЗАННІ скандаліста-мужа і пацярпелай-жонкі моцна разыходзіліся.

— Я не біў яе... Прызнаю, раўнаваў. Дадому прыходзіла позна. На работу тэлефаную — даўно пайшла. Пытаюся, дзе была, — толькі ўсміхаецца... Але я не біў... я не мог... Ну, наўмысна не біў, — расказваў Лінькоў. Голас зрываўся да хрыпу, скупыя рухі падкрэслівалі разгубленасць, збянтэжанасць і нават, здавалася, адчай.

— Ды хіба ты памятаеш! Зенкі свае зальеш... — ускочыла Ліньковa.

Прыйшлося прыструніць ісціцу. Тая пакорліва зірнула на пракурора, потым на суддзю і прамармытала:

— Прабачце...

Лінькоў яшчэ раз правёў далонню па валасах, хвіліну памаўчаў, быццам збіраючыся з духам.

— Адзін раз, памятаю, было такое: адштурхнуў Алену ад сябе. Не ведаю, можа, і ўпала. Я быў цвярозы. Яна тады крычала моцна, падскоквала чагосьці. А я не хацеў, каб скандал чулі суседзі... Сорамна... перад людзьмі сорамна... Так, потым я выпіў... Гарэлка заўсёды стаяла дома... — паслухмяна адказваў на пытанні падсудны. — Так, я купляў, Алена таксама купляла... Але я не біў яе, паважаны суд! Я не ведаю, адкуль узяўся той фінгал, сінякі... драпіны... Я нічога не разумею...

Чамусьці хацелася верыць гэтаму чалавеку. Але ён — суддзя і даўно забараніў сабе прыслухоўвацца да гэтых «веру — не веру». Гэта ў Бога можна верыць. А тут, у судзе, такога наглядзішся за трыццаць гадоў служэння Фемідзе, што сам сабе перастаеш верыць.

Суддзя ведаў: яго падапечныя, калі трэба, становяцца «белымі і пухнатымі». Толькі верыць ім — сябе не паважаць.

— Цыркач! Шкуру сваю ратуеш?! — віскнула ісціца, пацвярджаючы яго думкі.

Лінькоў толькі на міг падняў на жонку зялёныя вочы, потым разгублена, безнадзейна перавёў позірк у акно насупраць.

ГОЛАС ісціцы, калі ёй далі слова, спачатку зазвінеў маладым запалам, потым пачаў слабець, слабець:

— Ты за свае кулакі будзеш тут адказваць! Паважаны суд, ён увесь час піў! Пакуль цвярозы — нармальны. А як нап'ецца, трасе мяне бы грушу. Сорамна яму... Гэта мне! Мне сорамна з сінякамі ды фінгаламі ў людзі выходзіць. Па вуліцы іду, прахожыя прыглядаюцца. На рабоце калегі пытанні задаюць... Не вытрымаць... колькі можна... п'янь няшчасная...

Плечы жанчыны затрэсліся, твар перакасіўся, роўныя белыя гарошынкі-зубкі закусілі верхнюю губу, яна імкнулася стрымаць слёзы. Сакратар наліла ў шклянку вады і падала ісціцы. Алена прыняла яе тонкімі пальчыкамі з доўгімі пазногцямі, размаляванымі дзівоснымі ўзорамі. Суддзя глядзеў на гэтыя пазногці, на шчодра напамаджаныя вусны, якія пакінулі след на шклянцы, на прыгожы твар, з якога нервовым рухам Лінькова змахнула нябачныя слёзы.

Не, ёй чамусьці верыць не хацелася. Але факты — упартая рэч. Іх назбіралася цераз край, а некалькі заключэнняў судовай медыцынскай экспертызы, якія сведчылі аб нанесеных пабоях, завяршалі спіс геройстваў «цыркача». Ён жа цяпер сядзеў моўчкі і, здавалася, наогул знаходзіўся недзе далёка ад залы судовых пасяджэнняў.

— Усё не нахлебчацца свайго пойла. Усю душу выматаў, дрэнь ты гэткая! — вырваў з палону разваг лямант ісціцы.

Суддзя з-пад насупленых броваў паглядзеў на квітнеючую маладую жанчыну ў дарагім шэрым гарнітуры, з-пад якога замест «выматанай душы» какетліва выглядвала чырвоная блузка. Яркая жанчына. Побач з ёй даволі сімпатычны муж выглядаў шэрай моллю. Не дзіўна, што раўнаваў. І піў — хіба ад рэўнасці?

Хоць, калі верыць характарыстыцы з работы, мазгі яго працавалі добра і ў зносінах спакойны, роўны з усімі. Адзінае, што вылучылі як негатыўнае, дык гэта яго мяккацеласць, няўменне сказаць «не» нават там, дзе трэба. Дзіўна. Выходзіць, на рабоце цішэй вады, ніжэй травы, а дома, перад слабай жанчынай — герой? Чаму ж гэты герой выклікае жаль, а не жаданне пакараць па заслугах? Нават апошнім словам не змог абараніцца — звярнуўся толькі да жонкі.

— Прабач, калі ўсё так, як ты кажаш. Я не хацеў цябе пакрыўдзіць, — сказаў ён і сеў.

Ісціца расчаравана бзыкнула:

— Я ж кажу, цыркач...

— Імем Рэспублікі Беларусь... — голас суддзі гучаў роўна, упэўнена, як гэта заўсёды бывае, калі ён зачытвае прысуд. — На абскарджанне рашэння суда ў падсуднага ёсць дзесяць дзён...

У СВАІМ кабінеце суддзя зняў і павесіў у шафу мантыю, ускудлаціў сівыя валасы. Цімафей Іванавіч прысеў за стол. Да абедзеннага перапынку заставалася дваццаць хвілін. Сур'ёзна ўнікаць у іншыя рабочыя справы часу не было, ды і Лінькоў не выходзіў з галавы. Ясна ўявіўся яго твар з выразна акрэсленымі вуснамі і тонкімі чорнымі бровамі ў разлёт, быццам чараўнік намаляваў два птушыныя крылы.

«Быццам два птушыныя крылы! — ён падскочыў на крэсле і моцна ўдарыўся каленам аб дубовы пісьмовы стол, але болю не адчуў. — Як я адразу не здагадаўся...»

На хвіліну перанёсся ў маладосць і апынуўся ў старым невялічкім доміку, дзе прыемна пахла сырадоем і дранікамі: імі бабуля частавала ўнучка з нявестай пасля салодкай ночы. Адзінай у іх жыцці.

Бабуля была першай, з кім пазнаёміў Цімафей сваю Надзейку. Старая і маладая жанчыны адразу спадабаліся адна адной. А як інакш? Не мог Цімафей прывесці ў дом дрэннага чалавека, не магла бабуля не прыняць нявесту любімага ўнука.

— Які майстар якім чароўным пэндзлем распісваў твой твар?! — у захапленні правёў Цімафей пальцамі па твары каханай, калі бабуля выйшла за парог. Крануў бровы: — Не бровы, а два птушыныя крылы.

— Лётаць будзем разам, — аджартавалася Надзея і прытулілася да яго.

Але паляцець разам у маладых закаханых не атрымалася. Надзея паверыла плёткам, быццам ён заляцаецца да яе сяброўкі, а Цімафей вырашыў: «Не давярае, значыць, не кахае», — і яны раз'ехаліся, разышліся, каб больш не сустрэцца. Чуў потым, што Надзея развялася з мужам-вайскоўцам і разам з сынам вярнулася ў іх горад, а дваццаць гадоў таму памерла. Муж яе быў рускім, адсюль і нязвыклае для іх мясцовасці прозвішча, і звалі яго, здаецца, Сяргей... так, сапраўды, Сяргей.

АЛЯКСЕЙ Лінькоў быў падобны на маці, як дзве вішанькі з бабулінага саду.

Расхваляваўшыся, Цімафей Іванавіч пачаў прыгладжваць далонню валасы — і замёр. Гэтакі ж самы жэст! «Гос-па-дзі, як?»... — працяла мозг суддзі чарговая здагадка. Ён схапіў ліст паперы, выцер крупінкі халоднага поту, які выступіў на лбе. Націснуў кнопку тэлефона:

— Святлана, прынясіце справу Лінькова.

«Так... нарадзіўся ў восемдзесят сёмым, студзень... Дзевяць месяцаў таму — якраз красавік восемдзесят шостага. Чарнобыль...» Цімафей Іванавіч успомніў, што тады нават не ўспрыняў як належыць трагедыю. Дзе там! — калі ў душы пяшчотна і пышна квітнела каханне.

— Святлана, калі нехта будзе тэлефанаваць, скажы, буду пасля абеду.

— Добра, Цімафей Іванавіч.

Сакратар адказала, не адрываючы вачэй ад экрана камп'ютара, дзе набірала тэкст судовага пасяджэння. Гэта было добра, інакш яна б заўважыла разгубленасць і сарамлівасць суддзі.

Ён амаль выбег у калідор, пастараўся супакоіць дыханне і назнарок павольным крокам накіраваўся да лесвіцы. Розум пяты раз лічыў гады, месяцы. Усё супадала.

«Чаму яна не знайшла мяне, не сказала? Эх, Надзейка... Якія дурныя мы з табой былі...» — свідравала ў скронях.

З ВУЗКАГА цёмнага калідорчыка, які вёў у залу суда, нечакана пачуўся прыглушаны голас пракурора:

— Усё, хопіць... Цяпер на некаторы час нам трэба разысціся... не сустракацца... каб не прыцягваць залішняй увагі.

Яму адказаў ціхі жаночы смех. Пачулася характэрная валтузня.

Суддзя спыніўся ненадоўга, потым на дыбачках спусціўся з лесвіцы. У шырокім калідоры быццам прырос да сцяны, за вуглом якой зноў пачуліся галасы.

— Скажы, адкуль жа ў цябе ўзяўся фінгал і драпіны?

— Ну, фінгал мне паставіла фарфоравая статуэтка, якая, па тыпу, разбілася ў яго руках. І драпіны-сінякі сама сабе зварганіла, без праблем. Гэты дурань сп'яну ўсё роўна нічога не памятае.

— Не падобна, каб ён так моцна піў.

— Ну... у гэтым таксама можна дапамагчы...

— Шэльма, — рагатнуў пракурор. — Вучаніца пераўзышла настаўніка!

Жаночы голас адказаў хіхіканнем, якое падалося суддзі нялюдскім.

— Усё, я пабег. А то гэты стары ёлупень зараз на абед пойдзе, — зноў пачуўся голас пракурора.

— Пачакай, пачакай, — праныла жанчына. Затым інтанацыяй разбэшчанай дзяўчынкі праспявала: — Ты ж дапаможаш мне з кватэрай? М-м-м? Як абяцаў...

Чуваць было, як пракурор незадаволена засоп, пстрыкнуў замком партфеля, трохі пазней адказаў:

— Дапамагу... Але не цяпер! У нас яшчэ будзе час, калі ўсё ўляжацца.

«Вось яны — сапраўдныя цыркачы! Далёка да іх таму, каго я сёння на паўтара года ўпёк у калонію... Божа...» — ледзь не прастагнаў суддзя.

Думкі кідаліся і скакалі, як вадамеркі над роўняддзю сажалкі ў летні вечар. Суддзя набраў поўныя грудзі паветра, затрымаў яго, хутка выдыхнуў — і рашуча выйшаў з-за вугла. Вочы выпраменьвалі агонь, гатовы спапяліць разгубленую парачку. Голас празвінеў жалезам:

— Спадар пракурор, стары ёлупень усё чуў. Праз тры хвіліны чакаю вас у сваім кабінеце.

■ Хто каго?

# «МУРКА МЕСЦА СВАЁ ЗНАЕ: ПЕРШАЙ РЫБКУ АТРЫМАЕ...»



**Што было, — было: хлопцу аднаму дзяўчына спадабалася, прычым настолькі (можаце ўявіць?!), што ён яе на рыбалку ўзяў!..**
**Дзеўка на сёмым небе была! Маме потым расказвала, колькі ўсяго ўбачыла, колькі пачула-даведалася... Ну хоць бы з назваў рыб: у продажы ж ніколі не ўбачыш ні рыбы-паскуды, ні рыбы-сучары, ні падлюкі... Можа таму, што злавіць іх амаль немагчыма — хітрыя, мігам з кручка зрываюцца. А вось рыбка-лапачка, рыбка-заечка ды красава на яго трапляюць. Зблізку, праўда, больш нагадваюць плотак ды ляшчоў, але...**
**У судзе неяк крымінальная справа разглядалася. «Падсудны, вы згодны з абвінавачваннем: вы сапраўды лавілі рыбу без дазволу і вывудзілі 18 вялікіх язёў і шчупакоў?» — пытае суддзя. «Чысцюткая праўда, вінаваты я, прызнаю, — кажа рыбак. — Але ж шчырую просьбу маю: ці не мог бы васпан даць мне экзэмпляраў колькі прысуду — каб я мог яго сябрам паказаць?»**

Гэта, кажаце, пра нейкіх іншых аматараў рыбалкі? Магчыма. Але ж пра нашага (з верхняга здымка) напісана таксама шмат. Ды яшчэ і ў вершах... Ну вось як вам радкі **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды:**

*Янак — дзядзька зухаваты,*
*Зранку ён выходзіць з хаты,*
*З вудай крочыць да ракі...*
*І ўлоў яго такі,*
*Што дадому не данесці!*
*Толькі... коцікам пад'есці.*

Прыкладна тыя ж назіранні і ў **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў.** Адзінае — уважліва паглядзеўшы на здымак, ён заўважыў, што рыбак — з вусамі. А таму

*На рыбалку гоніць з хаты*
*Гаспадыня ўсіх вусатых,*
*Бо чарговы той улоў*
*На панюшку для катоў.*
*Дык нашто цягнуць дадому?*
*Хай ядуць ля вадаёму.*

І сапраўды, хай: спачатку — пасядзяць-пачакаюць, потым — пажывяцца... Люба ж, дорага паглядзець, бо котка — нават маленькая — гэта твор мастацтва! А значыць, можна зразумець рыбака.

*...Што гатоў*
*карміць катоў, —*
*Колькі змогуць з'есці!*
*І тады дамоў улоў*
*Лёгка будзе несці!*

Разважаюць так **сужэнцы Астроўскія з Мінска. А спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў** удакладняе, што лёгка — яшчэ і для кашалька:

*На спажытак для катоў*
*Янка ловіць акунькоў —*
*Любяць натуральнае.*
*Й па цане прымальнае...*

Ну сапраўды: пасядзеў гадзінку-другую, і ніякі «кіці-кэт» не патрэбен. Да таго ж...

Мае рацыю **спадар Валерый Гаўрыш:**

*Час на беразе ракі*
*Часта бавяць сябрукі,*
*У іх тады ідылія —*
*У Ваські і Васілія.*
*Ды й сумесны інтарэс.*
*Кожны нешта мае:*
*Васька, кот, далікатэс,*
*Дзядзька — спачывае.*

І чаго не ўспомніць тады! І аб чым (ды кім...) не падумае! Ну ўсіх чыста перабярэ — жонку, цешчу, дзяцей, начальства... А потым, перабраўшы...

Адзін з такіх пад вечар змотвае вудачкі ды сам сабе кажа, што калі б рыбалка так не супакойвала, то, відаць, усіх перадушыў бы!

Адкуль у гэтага «працэсу» такія, можна сказаць, лекавыя ўласцівасці? Ды відавочна ж: ад таго, што чалавек разнявolены, што ён нікуды не ляціць, не спяшаецца: сядзіць сабе сам-насам — з сабой, з прыродай.

«Упершыню ўступаючы ў «бітву тытанаў» «Хто каго?», няёмка рыфмаваць банальнае «рыбак-дружбакі», — піша **спадар Іван Сіманёнак з Паставаў.** — А таму я прапаную оду, прысвечаную коткам-жанчынам:

*Звычка ёсць —*
*спакон вякоў*
*На калені мужыкоў*
*Мякка лезуць «коткі»:*
*У «прыкідах» амаль «ню»*
*І ў заман-калготках...*
*Да багаценькіх спярша —*
*Каб на яхту-лодку,*
*А не выйдзе ні шыша,*
*Згодны і на... плотку!*

Зрэшты, нават у гэтым, апошнім, выпадку бяры вышэй, як той казаў! І як піша **спадарыня Ніна Бурко з Бярэзіншчыны:**

*Любай Нюрцы,*
*што той Мурцы,*
*Як падвернецца якая,*
*Ясь аддаў бы ўсё, што мае,*
*Гэтак котка сагравае!*

Заўважце: звычайная, а калі яшчэ і свая, любімая...

Тут, згадзіцеся, ужо асобная песня, нават дзве — ад **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска:**

*Надакучыла старая?*
*Ужо крыху «аблезла»?*
*Тут жа котка маладая*
*На калені ўзлезла!*
*Ёмка хоча сесці,*
*Першай рыбку з'есці.*

З таго ж канверта і ледзь не адваротнае:

*У катоў і мужыкоў*
*Звычка-завядзёнка:*
*Кожны з іх узяць гатоў*
*Маладую жонку.*
*Ды не ўсякаму вагон*
*Вось такога свята...*
*Хіба з твару хто — Дэлон,*
*Ці, як Гейтс, багаты.*

Як жа такім стаць? Злабадзённае пытанне. І адказ на... другое, здаецца, ведае **спадар Старых з Гомеля.** «За іншых казаць не бяруся, — папярэджвае Мікалай Валянцінавіч, — але я на здымку ўбачыў двух катоў. Галава другога — звярніце ўвагу — унізе, з левага краю. А таму ў якасці подпісу прапаную радкі:

*Мурка месца свае знае:*
*Першай рыбку атрымае.*
*Кот Пушок —*
*сядзіць далей —*
*Будзе ён лавіць мышэй...*
*Штось падобнае падчас*
*Можна бачыць сярод нас:*
*Лепшы кус таму даецца,*
*Хто каля начальства трэцца.*

Альбо праце, не пакладаючы рук... Мала, што сам, дык жа і іншым складзі не дае — на грудзях сашчапіць.

У адной кабеты, расказвалі, муж гэта зрабіў — развітаўся, бедны, з жыццём. Думаеце, удава яго дужа гаравала? Так. Але і абуралася: казала, што ён спецыяльна на той свет пайшоў — каб нічога не рабіць.

На такую спадарожніцу жыцця, як лічыць **спадарыня Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны,** і рыбаку са здымка «пашчасціла»:

*Жонка працай*
*«задзяўбала»*
*І ўсё мала ёй і мала...*
*Як праклятым, муж ішачыў!*
*Ды сябе інача бачыў:*
*Вуды ўзяць бы і ката...*
*Вось была бы любата!*

Пошукі ж, гэтай самай любаты, асалоды ад жыцця, згледзелі на фота і **мінчане Астроўскія:**

*Ёсць у Слаўкі завядзёнка,*
*Як мазгі выносіць жонка,*
*Ён да рэчкі лататы,*
*(А за ім — і ўсе каты)...*
*Зловіць рыбы альбо не —*
*Хоць ад звягі адпачне.*

Да таго ж — і памарыць зможа (разам са **спадарыняй Аленай Кулік з Валожыншчыны**):

*Вось удача дык удача*
*Ў Янкі атрымалася б,*
*Калі б рыбка залатая*
*На кручок папалася!*
*Але шчасціць не яму, —*
*Акунькам ды плоткам*
*Сумна дзядзьку самаму,*
*Спахмурнелі й коткі.*

(Ёсць ад чаго! Кажуць, неяк залатую рыбку Галкін злавіў. Толькі задумаўся, што б гэта папрасіць, як тая сама адазвалася: «Ідзі, — кажа, — дамоў, Максімка. У тваёй жонкі (каб не казаць старой) і без мяне ўсё ёсць»).

У іншых — няма, на вялікі жаль. І многага. А таму, паводле **спадара Юрыя Вінаградава з Бабруйска:**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Не відаць нідзе ракі...*
*Што ж тут робяць рыбакі?*
*Ды закінуць вуду*
*І чакаюць цуда.*
Тутэйшыя... Ці не так?

Але ж канчатковыя высновы рабіць не трэба, бо, як сцвярджае **спадар Сабалеўскі:**

*Не, Фядос — не дармаед:*
*На рыбалцы прападае —*
*На вячэру і абед*
*Коткам плотачак цягае.*

Прычым пад наглядам, бо кот (трэба разумець, той, што збоку сядзіць?), на думку **спадара Сіманёнка,** не хто іншы, як замаскіраваны... падатковы інспектар. Адкуль ода №2:

*Падаткоўцам — хлеб такі —*
*Трэ ўлавіць павевы...*
*Ну і пачулі: ад ракі*
*Ёсць прыбытак — левы,*
*То-бок Сеньку-рыбаку*
*Засвяціў дастатак...*
*У кішэнь яму руку:*
*Аддавай падатак!*

Пытанне рубам, як той казаў! Яшчэ і ад **сужэнцаў Астроўскіх:**

*Дзядзька Слаўка,*
*можа стацца,*
*Толькі рыбаю і жыў...*
*А падатак з тунеядца*
*Ён сплаціў ці не сплаціў?!*

...Вось такую карціну алеем, можна сказаць, намалявалі нашы чытачы. Засталося дадаць да яе хіба некалькі асобных не тое штрыхоў, не тое парад ад **спадарыні Гудачковай:**

*Навараў гароху, кашы —*
*Так прынаджваў*
*рыбу Яша...*
*Ды харчоў было замала, —*
*Рыбка хвосцік паказала.*

І тым не менш насуперак абставінам:

*Ёсць у Яшы —*
*кажуць гэтак —*
*Вельмі добрая прыкмета:*
*На рыбалку ўзяў ката, —*
*Юшка будзе — смаката!*

Чым яна, гэта юшка, адрозніваецца ад рыбнага супу? Як тлумачыла армянскае радыё, чаркай гарэлкі, якая ўліваецца ў варыва і выпіваецца, перш чым есці.

(Расказвалі: рыбакі, натаміўшыся (ад усяго, відаць...), неяк спаць палеглі. Але не ўсе: двое каля вогнішча засталіся, і адзін знячэўку як чхне! Другі яму: «Будзь здароў!» І ціхутка ж, як быццам, а з палаткі тут жа галасы: «Чаму нам не наліваюць?»

А налілі б (трэба разумець, зноў?) і што тады? Ды нічога добрага, як лічыць **спадар Сабалеўскі,** то-бок:

*Плюй-не плюй на чарвяка,*
*Не ад рыбы ён загіне:*
*Як калоціцца рука,*
*Лепш лаві ў... магазіне.*

Дарэчы, наконт лоўлі (і не толькі рыбы): на здымку — ніякіх таямніц (ва ўсякім разе для **сужэнцаў Астроўскіх**):

*Відавочна: у дзеда Слаўкі*
*Ў заняпадзе гаспадарка.*
*Там становішча такое,*
*Што ніхто мышэй не ловіць.*

Ну сапраўды: і сам тут, і каты — абодва...

Зрэшты, за хвасты іх цягнуць не будзем, бо самы час падвесці вынікі. Такім чынам, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, да папярэдняга здымка (на ім, нагадаем, былі два, можна сказаць, разутыя і раздзетыя мужчыны, якія некуды ішлі (гл. «Звязда» за 25 лютага), найлепшыя подпісы прапанавалі **спадары Валерый Гаўрыш з Чавусаў, Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны, сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадарыні Бажок з Бабруйска, Ніна Бурко з Бярэзіншчыны, Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў...**

«Не ведаю, як іншыя, — піша Валянціна Апанасаўна, — а я заўсёды чакаю новых конкурсных аглядаў, новых здымкаў. І ўжо тады — свята: і пасмяюся ад душы, і падзівлюся-падумаю: колькі ж нечаканых прапаноў, колькі трапных і павучальных радкоў, колькі сапраўдных самародкаў-талентаў сярод нас, падпісчыкаў «Звязды»!»

Што праўда, тое праўда!

Дык хто ж перамог, хто на чарговай «дыстанцыі» абышоў іншых? Маленькае рэдакцыйнае журы трохі павагалася паміж радкамі **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў** *(«Што віно, што казіно, а пахмелле ўсё ж адно: прыпаўзуць хлапцы да хат без штаноў і без зарплат»)* і **спадарыні Бажок з Бабруйска:** *«Усё на фота больш, чым проста, / Там... інспекцыя за мостам. / Завітай, аддай падаткі / Ды шыбуй сабе да хаткі».* І перавагу ўрэшце аддало жанчынам.

Такім чынам, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на трэці квартал накіроўваецца ў Бабруйск. А мог бы...

Са спазненнем, на жаль (рабіце высновы), даслала свае радкі **спадарыня Галіна Пятроўская са Смаргоншчыны:**

*Надыходзіць сакавік —*
*Свята у кабеты...*
*Што падорыць ёй мужык,*
*Калі сам раздзеты?*
І яшчэ:
*Нам бананы не спакуса,*
*І не дзіва кавуны:*
*Няма бульбы ў беларусаў, —*
*І з мужчын спаўзуць штаны.*

То зараз самы час насенне яе выносіць са скляпоў, прагравaць, «зеляніць». А там, глядзіш, і спяшацца з пасадкай. Прыкладна, як жанчына з новага конкурснага здымка. Паглядзелі? Усміхнуліся? Пішыце!

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

**Ад яе ж** шчырыя прабачэнні ўсім, чые подпісы не прайшлі строгага конкурснага адбору.


## СА «ЗВЯЗДОЙ» — УСЁ Ў ПАРАДКУ

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або I паўгоддзе 2017 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 7 красавіка 2017 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.
Сярод падпісчыкаў 12 красавіка 2017 года будуць разыграны 7 прасаў Tefal і суперпрыз — пыласос Bosch. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 22 красавіка 2017 года.
Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 чэрвеня 2017 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або I паўгоддзе 2017 года і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Са «Звяздой» — усё ў парадку!» чытайце ў нумары 43 газеты «Звязда» ад 3 сакавіка 2017 года.
Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.
Тэрмін правядзення гульні — з 04.03.2017 па 30.06.2017 года.







Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2944 ад 01.03.2017 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал і I паўгоддзе 2017 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
на II квартал і I паўгоддзе 2017 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ________ (індэкс) ____________________

Удачы ў розыгрышы!

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

На 31 декабря 2016 года

| | |
|---|---|
| **Организация** | Открытое акционерное общество «Завод «Белпласт» |
| **Учетный номер плательщика** | 100008342 |
| **Вид экономической деятельности** | 22290 22220 25111 |
| **Организационно-правовая форма** | 1131 |
| **Орган управления** | 86090 |
| **Единица измерения** | тыс. руб. |
| **Адрес** | 220079, г. Минск, ул. Гусовского, 2 |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 5 047 | 4 990 |
| Нематериальные активы | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 2 | 2 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 1 | 1 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 15 | 15 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **5 065** | **5 008** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 645 | 739 |
| в том числе: материалы | 211 | 346 | 347 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 3 | 4 |
| готовая продукция и товары | 214 | 296 | 388 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 15 | 14 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 22 | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 1 046 | 387 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | - | - |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **1 728** | **1 140** |
| **БАЛАНС** | **300** | **6 793** | **6 148** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 126 | 126 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | 5 083 | 5 083 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (843) | (155) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **4 366** | **5 054** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 131 | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **131** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 1 170 | 270 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 1 126 | 824 |
| в том числе: | | - | - |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 147 | 340 |
| по авансам полученным | 632 | 764 | 270 |
| по налогам и сборам | 633 | 38 | 43 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 8 | 22 |
| по оплате труда | 635 | 92 | 81 |
| по лизинговым платежам | 636 | | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 1 | 1 |
| прочим кредиторам | 638 | 76 | 67 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **2 296** | **1 094** |
| **БАЛАНС** | **700** | **6 793** | **6 148** |

### Отчет о прибылях и убытках за январь – декабрь 2016 г.

| Наименование показателей | Код строки | За январь-декабрь 2016 года | За январь-декабрь 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 2 061 | 2 196 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (1 943) | (1 809) |
| Валовая прибыль | 030 | 118 | 387 |
| Управленческие расходы | 040 | (586) | (623) |
| Расходы на реализацию | 050 | (118) | (32) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | (586) | (268) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 8 | 11 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (75) | (50) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | (653) | (307) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 362 | 315 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (131) | (175) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 102 | 2 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (368) | (178) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (35) | (36) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (688) | (343) |
| Налог на прибыль | 160 | - | |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | 15 |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | (1) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (688) | (329) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | (688) | (329) |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | |

Количество акционеров на конец отчетного периода – 143, в том числе: юридических лиц – 4, физических лиц – 139.

Данные отчетности подтверждены аудиторской проверкой ООО «Траст-аудит Плюс», зарегистрированной решением Мингорисполкома от 18.12.2013 г. №192181088. Бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Завод «Белпласт» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение на 31 декабря 2016 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 28 марта 2017г.

**Директор** **В.Е. Финогенов**
**Главный бухгалтер** **Г.А. Капусто**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВОЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

**Организатор аукциона** – Лельчицкий районный исполнительный комитет.

**Предмет аукциона** – право заключения договора аренды на земельный участок, площадью 0,0680 га с кадастровым номером 322881201601000548, расположенный по адресу: Гомельская область, Лельчицкий район, аг. Глушковичи, ул. Советская, 23. Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне рек, водоемов, в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (в охранной зоне линий связи и радиофикации, в охранной зоне электрических сетей).

**Целевое назначение использования земельного участка** - для строительства и обслуживания парикмахерской с магазином (земельный участок для размещения объектов бытового обслуживания населения). Срок аренды земельного участка – 25 (двадцать пять) лет.

Начальная цена продажи – 82,98 (восемьдесят два рубля девяносто восемь копеек);

Сумма задатка – 8,30 (восемь рублей тридцать копеек);

Размер шага аукциона составляет 10% от предыдущей цены, названной аукционистом.

**Условия продажи:**

- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;
- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;
- заключение победителем аукциона с Лельчицким районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в установленном порядке государственной регистрации права на земельный участок;
- разработка и утверждение в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;
- снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно строительному проекту;
- освоение земельного участка в срок до шести месяцев после разработки и утверждения проектно-сметной документации;
- осуществление строительства на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

1. Аукцион состоится **3 мая 2017 г. в 10.00** в здании Лельчицкого районного исполнительного комитета, каб. 209, по адресу: **г. п. Лельчицы, ул. Советская, 42.**

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели и юридические лица, подписавшие соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона на право заключения договора аренды земельного участка.

Для участия в аукционе необходимо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подать в землеустроительную службу райисполкома в установленный в настоящем извещении срок заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона.

***3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30, последний день приема документов – до 17.30 28 апреля 2017 года по адресу: г. п. Лельчицы, ул. Советская, 42. Заключительная регистрация участников – 3 мая 2017 г. с 9.00 до 9.45.***

***4. Сумма задатка перечисляется на счет №3641421000035, в ЦБУ №315 г. п. Лельчицы филиала №300 ГУО ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, МФО 151501661, УНП 400032854, получатель – Лельчицкий районный исполнительный комитет.***

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

6. Организатор открытого аукциона вправе отказаться от аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до проведения аукциона. За дополнительной информацией обращаться в Лельчицкий районный исполнительный комитет (землеустроительная служба), контактные телефоны в г.п. Лельчицы: 8 (02356) 5-02-51, 5-08-33.

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества УПУП «Гродненская областная автошкола» 26 апреля 2017 года

| Вид аукциона | Открытый |
|---|---|
| Предмет аукциона | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-108917 (целевое назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – платная автостоянка) площадью 2852,8 кв. м. В состав объекта входят: покрытие территории (асфальтобетон, бетон), бордюр для отделения проезжей части, ограждение из металлической сетки, домик для дежурных, хозяйственный сарай, металлический сарай, смотровая яма, туалет). Год постройки – 1978. |
| Начальная цена продажи | **49 950 рублей (с учетом НДС 20%)** |
| Кадастровый номер земельного участка и вид вещного права | **440100000002002100,** право временного пользования |
| Месторасположение земельного участка | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Белуша, д. 45** |
| Размер земельного участка | **0,3300 га** |
